Государственная научная библиотека Н.Т.У.-Б.С.А.Х. Инв. №
Москва, Б-ка ВСНХ ЗЬЯ. студ.

ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым падсткам „Прафрук“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок пост. п... Іншагароднія абв... Паскрод тэксту—... Пры шматразовым... ка. Звыш тарыфу... СНК ад 10-IX-24 г. ... вдачку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 13 кастрычніка 1930 г.
№ 240 (3838)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

ЗАНЯЦЬ СВАЕ МЕСЦА!

Саўгасы БССР ня ідуць у авангардзе байцоў за тэмпы асеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі

МЕНСК, 13 кастрычніка.

Пасьпяховае выкананьне бягучых гаспадарчых задач, далейшае разьвіцьцё сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі ў значнай ступені залежыць ад якасьці і выразнасьці работы нашай саўгаснай сыстэмы. Саўгасы павінны рэалізаваць вялікія гаспадарчыя праграмы, яны (саўгасы) зьяўляюцца вялізарнейшым фактарам перавыхаваньня бядняцка-серадняцкіх мас і ўцягненьня іх на шлях буйное аграмаджанае гаспадаркі.

Посьпехі, дасягнутыя ў саўгасным будаўніцтве, відавочны. Але мы вымушаны канстатаваць, што цэлы рад саўгасаў БССР зусім не спраўляецца са сваімі задачамі, ня выконвае гаспадарчых плянаў. Ня гледзячы на агульнае выкананьне пасеўнага пляну (99.3 проц.), 13 саўгасаў сарвалі заданьне на сяўбе, паменшыўшы азімы клін на 443 гэкт. Становішча з уборкай бульбы ва многіх саўгасах зусім незадавальняючае. Саўгасы надзвычай слаба праводзяць збожжазагатоўкі. У частцы саўгасаў панує бясплянавасьць, безгаспадарчасьць, якія часамі мяжуюцца з простым шкодніцтвам.

Прычынай падобных правалаў у рабоце саўгаснай сыстэмы зьяўляецца перш за ўсё праваапартуністычная бязьдзейнасьць кіраўніцтва раду саўгасаў, наяўнасьць самацёку ў рабоце.

Як можна інакш расцэньваць такія факты, калі нават у Белсельтрэсьце зрыў уборкі ўраджаю ў саўгасе імя **Х-годзьдзя БССР** лічаць «зусім нармальным, бо на кожнага рабочага прыпадае 9 гэктараў». Чаго варты падобны адказ «кіраўнікоў», замест безадкладных мерапрыемстваў па ліквідацыі прарыву, замест мабілізацыі ўсіх рабочых саўгасу па ўдесяцярэнныя тэмпы работы.

Чым інакш, як ня правым апартунізмам на практыцы, можна расцэньваць тое, што ў радзе саўгасаў **(Косіно, Лясковічы, імя Х-годзьдзя БССР)** парт'ячэйкі стаяць у баку ад баявых задач сёньняшняга дня, не арганізуюць рабочыя калектывы на выкананьне пляну с.-г. кампаніі, не арганізуюць сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва?

Нельга не адзначыць, што прарывы ва ўказаных саўгасах не прыцягнулі належнае ўвагі і раённага кіраўніцтва.

З усёй рашучасьцю трэба ўдарыць па настроях самацёку, расхлябанасьці і бязьдзейнасьці, зьнімаць з работы кіраўнікоў, нездольных змагацца за выкананьне гаспадарчых праграм.

У карэспандэнцыях, якія зьмяшчаюцца сёньня, рэзка кідаецца ў вочы агідная пастаноўка прафработы ў саўгасах. Адсутнасьць выхаваўчай работы, хвасьцізм прафорганаў цягнуць за сабой падзеньне працоўнай дысцыпліны, мізэрную прадукцыйнасьць працы і г. д.

У сьвятле гэтых фактаў надзвычай паказальна, што там, дзе раённыя арганізацыі зварачаюць саўгасам належную ўвагу, дзе парт'ячэйкі, гаспадарнікі і прафорганы здолелі арганізаваць сацспаборніцтва, узьняць хвалю працоўнага гэраізму, там мы маем поўнае выкананьне пляну, маем баявыя тэмпы работы. Лепшым прыкладам у гэтым сэнсе можа служыць Чырвона - Слабодзкі раён, дзе, напрыклад, саўгасы поўнасьцю і ў тэрмін аўладалі азімым клінам.

Становішча, якое стварылася ў радзе нашых саўгасаў, зусім нецярпіма і патрабуе безадкладных мер па карэнным паляпшэньні работы ўсёй саўгаснай сыстэмы.

З усёй вострасьцю паўстае пытаньне аб узмацненьні ўвагі пытаньням саўгаснага будаўніцтва, аб паляпшэньні кіраўніцтва Белсельтрэсту саўгасамі, аб устанаўленьні штодзённага кіраўніцтва з боку райкому саўгаснымі парт'ячэйкамі.

Бязьлітасна змагаючыся з усякімі праявамі правага апартунізму ў пытаньнях саўгаснага будаўніцтва, усямерна ўзмацняючы гаспадарчае становішча саўгасаў, мы павінны дабіцца і даб'емся таго, каб саўгасы БССР сапраўды зьяўляліся «станавым храбтом перабудовы старага ўкладу вёскі».

КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ ПАТРАБУЕ:

мацней наступаць на кулацтва,

ЖОРСТКА ЗМАГАЦЦА З ПРАВАЙ І „ЛЕВАЙ“ АПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫКАЙ У КАЛГАСНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

ХВАЛЯ калгаснага прыліву

У Петрыкаўскім раёне арганізавана 6 новых калгасаў, 20 ініцыятыўных груп, 148 гаспадарак уступіла ў арцелі

ПЕТРЫКАЎ. (Па тэлеграфу).

Пад уплывам посьпехаў перадавых калгасаў у раёне пачаўся новы калгасны прыліў. За апошні час арганізавана 6 новых калгасаў. У часе асеньняй сяўбы ў калгасы ўступіла 148 адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Створана 20 ініцыятыўных груп, якія разгортваюць работу па ўцягненьні новых мас адзінаасобнікаў у калгасы. Праводзім першы раённы зьлёт ударнікаў-калгаснікаў.

РАЙШТАБ.

65 ГАСПАДАРАК—У КАЛГАСЫ

НАРОЎЛЯ (РАЙШТАБ).

На 10 кастрычніка плян пасеўнай кампаніі па калгасах выкананы на 83 проц. Прыліў у калгасы за час асеньняй сяўбы 65 гаспадарак.

Калгас „Чырвоны баявік“ НЯ ПРЫМАЕ новых членаў

Заявы адзінаасобнікаў некалькі месяцаў ляжаць неразгледжанымі

Зруйнаваць кулацкі бар'ер

ЖЛОБІН (ПА ТЭЛЕФОНУ)

КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ БАЯВІК», ЖЛОБІНСКАГА РАЁНУ, СЬВЯДОМА ЗРЫВАЕ НОВЫ ПРЫЛІЎ. КАЛГАС АДГАРАДЗІЎСЯ СЬЦЯНОЮ АД АДЗІНААСОБНІКАЎ І НЯ ПРЫМАЕ НОВЫХ ЧЛЕНАЎ. УЖО НЕКАЛЬКІ МЕСЯЦАЎ У ГЭТЫМ КАЛГАСЕ ЛЯЖЫЦЬ ШМАТ ЗАЯЎ АБ ПРЫЕМЕ, ЯНЫ ДА СЁНЕШНЯГА ДНЯ НЕ РАЗГЛЕДЖАНЫ. КІРАЎНІКІ КАЛГАСУ ЗАЯЎЛЯЮЦЬ АДЗІНААСОБНІКАМ: «МЫ І БЯЗ ВАС АБЫЙДЗЕМСЯ. НАМ БЯЗ ВАС ЛЕПШ». РАЁНЫ І КАЛГАСНА-КААПЭРАЦЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І РАЙКОМ ПАРТЫІ ВЕДАЮЦЬ ГЭТЫ АГІДНЫ ФАКТ, АЛЕ НЯ ЎЖЫВАЮЦЬ ПАТРЭБНЫХ ЗАХАДАЎ. КУЛАЦКАЯ ЛІНІЯ ПРАЎЛЕНЬНЯ КАЛГАСУ «ЧЫРВОНЫ БАЯВІК» НЕ АСУДЖАНА І НЯ ВЫПРАЎЛЕНА.

ПОСТ «ЗЬВЯЗДЫ»: С-а.

Барвенаўскі сельсавет праводзіць кулацкую лінію

„З калектывізацыяй пачакаем...“

УВАРАВІЧЫ (Па тэлеграфу).

Яшчэ некалькі месяцаў пазад у Барвенаўскі сельсавет, Уваравіцкага раёну, зьвярнулася мясцовая беднота з просьбай дапамагчы ёй арганізаваць калгас. Райком партыі са свайго боку накіраваў у сельсавет упаўнаважанага РК, партыйца Паддубнага. Паддубны пальцам не паварушыў, каб арганізаваць калгас і нават не сказаў барвенаўскай беднаце ні аднаго слова пра калектывізацыю. Член партыі Фінаеў, таксама накіраваны ў Барвенаўскі сельсавет, заявіў беднаце: «мы з калектывізацыяй пачакаем».

Сам сельсавет дапамагае апартуністым сарваць арганізацыю калгасу. Ініцыятыўная група з 15 батрацка - бядняцкіх гаспадарак патрабуе арганізацыі калгасу, але старшыня Барвенаўскага сельсавету, Канавалаў, тармозіць і зрывае гэту справу. Сакратар сельсавету катэгарычна адмаўляецца ўступіць у калгас і таму імкнецца не дапусьціць яго арганізацыі. Мясцовая партыйная ячэйка стаіць у баку. Яна не змагаецца з падкулачнікамі з Барвенаўскага сельсавету, якія зрываюць арганізацыю калгасу. Райком партыі рашучых захадаў ня ўжыў.

САЛДАЦЕНКА.

Прыліў пашыраецца

За два дні ў калгасы „Іскра сацыялізму“ і „Перамога“ ўступіла 23 новыя гаспадаркі

РАГАЧОЎ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

44 КАЛГАСЫ РАЁНУ З ПОСЬПЕХАМ СКОНЧЫЛІ СЯЎБУ АЗІМЫХ. ПААСОБНЫЯ КАЛГАСЫ ЗНАЧНА ПЕРАВЫКАНАЛІ ПЛЯНЫ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ. У АВАНГАРДЗЕ ІДЗЕ КАЛГАС «ІСКРА САЦЫЯЛІЗМУ», ЯКІ ВЫКАНАЎ ПЛЯН СЯЎБЫ АЗІМЫХ БОЛЬШ, ЧЫМ НА 300 ПРОЦ. ПАД УПЛЫВАМ ПОСЬПЕХАЎ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ ПАЧАЎСЯ НОВЫ КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ. У КАЛГАСЫ «ІСКРА САЦЫЯЛІЗМУ» І «ПЕРАМОГА» ЗА АПОШНІЯ ДВА ДНІ ЎСТУПІЛА 23 АДЗІНААСОБНЫЯ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ ГАСПАДАРКІ. КАЛГАС У ВЕСЦЫ ХАДАСЭВІЧЫ АБВЯСЦІЎ СЯБЕ ЎДАРНЫМ НА ХУТЧЭЙШЫМ СКАНЧЭНЬНІ АСЕНЬНЯЙ С.-Г. КАМПАНІІ.

Рэйштаб: САЛАДУХІН.

САЎГАСЫ ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАГА РАЁНУ СКОНЧЫЛІ АСЕНЬНЮЮ СЯЎБУ

Ч.-СЛАБАДА (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

Саўгасы Чырвона-Слабодзкага раёну цалкам скончылі сяўбу азімых. Па калгасах, за выключэньнем трох с.-г. арцеляй, асеньняя сяўба таксама скончана. Гэтыя тры калгасы абавязаліся да «дня калектывізацыі і ўраджаю» пасеўную кампанію скончыць. Першымі ў раёне скончылі асеньнюю сяўбу і ўборку бульбы калгасы «Усход» і «Нараджэньне сацыялізму».

Убраць апартуністых з кіраўніцтва саўгасу імя дзесяцігодзьдзя БССР

У БУЙНЕЙШЫМ САЎГАСЕ БЕЛАРУСІ АСЕНЬНЯЯ С.-Г. КАМПАНІЯ ПАД УДАРАМ

Ганебны прарыў ва ўборцы Белсельтрэст лічыць „нармальным зьявішчам“

МАР'ІНА, 12. (Па тэлеграфу).

Становішча саўгасу імя Дзесяцігодзьдзя БССР зьяўляецца выключна трывожным. Асеньняя с.-г. кампанія, праграма будаўніцтва ў саўгасе — пад ударам. Да сёньняшняга дня саўгас **ня ўбраў 170 га аўсу.** Скошаны, але ня ўбраны авёс псуецца. Загінулі таксама сотні га пяўбранай сенажаці. Марудныя тэмпы ўборкі прывялі да таго, што **25-30 проц. усяго ўраджаю ў саўгасе асыпалася.** Да гэтага часу ня ўбрана 18 проц. пасеваў тэхнічных культур (ільну і інш.). Лён пачаў псавацца. Уборка бульбы амаль зусім не разгорнута. Ёсьць рэальная пагроза, што да 40 проц. пасеваў бульбы зазімуе на полі.

Дырэкцыя саўгасу ня ўжыла патрэбных мер, каб ліквідаваць гэтыя прарывы. Партыйная ячэйка не мабілізавала камуністых і беспартыйных рабочых на сваячасовае правядзеньне ўборачнай і пасеўнай кампаній. Замест гэтага, кіраўніцтва саўгасу і партыйная ячэйка апраўдваецца «аб'ектыўнымі» прычынамі.

Кіраўніцтва з боку Белсельтрэсту **нікуды ня вартае.** Белсельтрэст нічога не зрабіў, каб дапамагчы саўгасу сваячасова падрыхтавацца і правесьці ўборку ўраджаю. Нават цяпер, калі становішча, якое стварылася ў саўгасе, зьяўляецца **пагражаючым,** Белсельтрэст ня ўжывае рашучых мер. Работнікі Белсельтрэсту заяўляюць, што зрыў уборкі ў саўгасе... нармальнае зьявішча. Пры гэтым Белсельтрэст спасылаецца на тое, што саўгас «мае значныя засевы», што «ў саўгасе на кожнага рабочага прыпадае па 9 га» і г. д.

Праграма будаўніцтва ў саўгасе **сарвана. На чале будаўнічых работ увесь час стаяў шкоднік, які да гэтага часу ня зьняты.**

Патрабуем тэрміновых мер. Правал асеньняй с.-г. кампаніі ў саўгасе павінен быць на чым-бы там ні стала папярэджаны.

Пост «Зьвязды»: Е. С.

БЮЛЕТЭНЬ № 7

На аснове матар'ялу праверкі ўсебеларускі штаб канстатуе, што частка саўгасаў недапушчальна **адстае** ў правядзеньні асеньняй с.-г. кампаніі. У прыватнасьці ў буйнейшым саўгасе Беларусі—саўгасе імя 10-годзьдзя БССР асеньняя с.-г. кампанія знаходзіцца ў пагражаючым становішчы. Белсельтрэст **ня прыняў** патрэбных мер, каб забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў асеньняй с.-г. кампаніі ва ўсіх сваіх саўгасах.

Райштабы паведамляюць аб новым прыліве ў калгасы. Так, паводле тэлеграмы Петрыкаўскага раённага штабу ў калгасы раёну за час асеньняй сяўбы ўступіла 148 адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У раёне створана 6 новых—калгасаў і 20 ініцыятыўных груп па арганізацыі с.-г. арцеляй. У перадавыя калгасы Рагачоўскага раёну «Іскра Сацыялізму» і «Перамога» толькі за два апошнія дні ўступіла каля 25 гаспадарак.

Адначасова прыходзіцца канстатаваць, што значная частка раённых партарганізацый яшчэ стаіць у тылу калгаснага руху і не змагаецца за новы прыліў у калгасы (Брагін і інш.).

Невыстарчальна разгорнута змаганьне са шкодным замкнутасьцю калгасаў, са спробамі паасобных калгасаў сарваць новы прыліў (калгас «Чырвоны Баявік»).

Становішча з уборкай бульбы характарызуецца наступнымі лічбамі: па калгасах БССР на 10 кастрычніка бульба выкананa на 50%. Аднак, у цэлым радзе раёнаў (Слуцкі, Клічаўскі, Чэрвеньскі, Лупалаўскі, Заслаўскі) процант выкананьня пляну ўборкі бульбы значна ніжэйшы. **Карэннага зруху ва ўборцы бульбы яшчэ не наступіла.**

Гнілы трыкутнік

ЗЛАЧЫННАЯ БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ ПАРАЛІЖУЕ САЎГАС КОСІНА

ЗЬНЯЦЬ КІРАЎНІЦТВА

ЛАГОЙСК, 12 кастрычніка.

Саўгас **КОСІНА**, які зьяўляецца адным з самых буйных у Лагойскім раёне, мае ўсе ўмовы, каб стаць узорнай гаспадаркай. У саўгасе працуе да 100 рабочых, ёсьць трактарная калёна з 7 машын, уласнае прамысловае прадпрыемства і г. д. Аднак на прычыне злачыннай бязьдзейнасьці грыкутніка саўгас на парозе развалу.

У саўгасе панує безгаспадарчасьць. **С.-г. машыны ды інвэнтар валяюцца ў беспарадку, іржавеюць і псуюцца.** Уборка ўраджаю праходзіць з ігнай марудпасьцю. На палёх саўгасаў да сёньняшняга дня ня ўбраны значныя пасевы аўсу і ячменю. Ніякай арганізацыі працы няма. Працоўная дысцыпліна ганебна расхістана. **З 100 рабочых на работу выходзіць ня больш 30 чал.** Прагулы пагражаюча растуць. З разгільдзяямі і прагульшчыкамі не вядзецца ніякага змаганьня. Па сутнасьці, ураджай яравых убірала толькі студэнцкая брыгада, якая прыяжджала на дапамогу саўгасу. Большасьць рабочых ва ўборачных работах ня ўдзельнічае. У саўгасе зарэгістраваны шматлікія факты п'янства і хуліганства.

Праграма будаўніцтва ня выкананa. Гараж для трактараў, скотныя хлявы і г. д. не пабудаваны. **Каровы начуюць пад адкрытым небам.**

Кіраўніцтва саўгасу, ячэйка КП(б)Б, рабачком не рэагуюць на ўсе гэтыя факты. **Трыкутнік бязьдзейнічае, замяшаўся, апусьціў рукі.** Раённыя ўстановы ня ўжылі патрэбных мер, каб аздаравіць саўгас. Толькі РСІ прабавала сёе-тое зрабіць, але і да гэтага часу канкрэтных вынікаў няма. Апартуністычнае кіраўніцтва саўгасу з работы ня зьнята. **Становішча саўгасу застаецца пагражаючым.**

АКСЁНАЎ.

107 проц. пляну

Саўгас імя 1 мая перавыканаў заданьне

Дуброўна. (Па тэлеграфу). Калгас **«РАСЬСЬВЕТ»** скончыў асеньнюю сяўбу, перавысіўшы заданьне на **11 гэкт. Плян збожжазагатовак выкананы на 200 проц.** З саўгасаў напярэдзе ідзе саўгас **імя 1 мая.** Саўгас скончыў уборку ўраджаю і асеньнюю сяўбу, выканаўшы плян пасеўнай кампаніі на **107 проц.** Плян зяблева ў саўгасе выкананы на сёньнні дзень на 27 проц.

З перавышэньнем

ТАЛАЧЫН, 11. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). ПЛЯН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ПРАЛЕТАРСКІМ ЦЭНТРАМ ВЫКАНАНЫ ТАЛАЧЫНСКІМ РАЁНАМ З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ — ЗАМЕСТ ВЫЗНАЧАНЫХ 1.113 ТОН АДГРУЖАНА 1.186. ЗАРАЗ ЎЖЫТЫ ЎСЕ МЕРЫ ДА ЗАВЕСЬПЯЧЭНЬНЯ БУЛЬБАЙ КРУХМАЛЬНІ.

Шкадарэвіч, Кручковіч.

Белсельтрэст дапускае развал саўгасу Лескавічы

У саўгасе гіне ўраджай, зрываецца будаўніцтва, іржавеюць і псуюцца машыны

СІРОЦІНА, 11 кастрычніка.

У саўгасе ЛЕСКАВІЧЫ, Сіроцінскага раёну, зрываецца асеньняя с.-г. кампанія. Уборка ўраджаю ня скончана. Сена пагніло ў копах. Канюшына ўся загінула на полі. Сіласныя культуры ўсё яшчэ ня скошаны. Недапушчальнае спазьненьне з уборкай бульбы, ільну і інш. культур прывяло да значнага псаваньня пасеваў. Пасеўны плян ня выконваецца. Наяўная рабочая сіла выкарыстоўваецца нерацыянальна. Цьвёрдага рабочага пляну няма.

Праграма будаўніцтва правалена. Скотныя хлявы не пабудаваны. Каровы і сьвіньні стаяць у вадзе і грязі. Гэта стала прычынай захворваньня жывёлы. Між тым, будаўнічы матар'ял, які быў у саўгасе, часткова выкарыстаны не па прызначэньні (на рамонт кватэр для дачнікаў і г. д.).

Гаспадарка вядзецца нядбайна і дрэнна. Усе гаспадарчыя і жыльлёвыя будынкі ў саўгасе знаходзяцца ў разбураным стане. Сады і агароды запушчаны і пачалі зарастаць бур'янам. Кіраўніцтва саўгасу дапускае абураючыя зловживаньні. Таварная прадукцыя прадаецца прыватніку. Так, напрыклад, саўгас прадаў прыватным асобам 27 шт. сьвіней. Разбазарваюцца некаторыя каштоўныя прадукты (мёд і інш.).

Мясцовая ячэйка КП(б)Б не сыгналізавала аб становішчы, якое стварылася ў саўгасе, не змагалася з усімі гэтымі агіднасьцямі. Сацспаборніцтва, ударніцтва, самакрытыка ў саўгасе не разгорнуты. Не вядзецца ніякай прафработы. Бязьдзейнасьць партыйнай ячэйкі пераросла ў правы апартунізм на практыцы. Райком партыі два разы прабаваў аздаравіць саўгас. Перад Белсельтрэстам было ўзьнята пытаньне аб становішчы саўгасу. Аднак, Белсельтрэст пальцам не паварушыў, каб ужыць адпаведныя захады.

РУЧ

РАСТУЦЬ РАДЫ КАМУНАРАЎ

ШКЛОЎ. (Наш спэц. кар.). Камуна «Іскра» ідзе наперадзе калгасаў Шклоўскага раёну. Камуна поўнасьцю скончыла ўборку ўраджаю яшчэ 15 жніўня. 17 жніўня камунай быў зданы першы чырвоны абоз у 4½ тоны жыта. Пасеўны плян выкананы.

Уборка бульбы канчаецца ў бліжэйшыя дні. На сёньнішні дзень з 30 гэктараў бульбы ўбрана 20.

«Іскра» дапамагла сваімі машынамі вакольным калгасам і адзінаасобным гаспадаркам ва ўборцы і сяўбе. Дапамога аказана: Новабраскаму кусту калгасаў, калгасу імя Фрунзэ, камуне імя Молатава, калгасам імя Карла Маркса, імя Валадарскага ды іншым.

У выніку гэтых посьпехаў за апошні час у камуну ўступіла 16 бядняцка - серадняцкіх гаспадарак.

С. Г.

Сяўба скончана з посьпехам

БАБРУЙСК. (Наш кар.). **Асеньняя сяўба ў Бабруйскім раёне амаль скончана. У радзе калгасаў плян сяўбы выкананы з перавышэньнем—на 115-120 проц.**

Уборка яшчэ ня скончана. У большасьці калгасаў ня ўбрана сена. Бараніцкі калгас скончыў сяўбу адным з першым, але да сёньняшняга дня ня ўбрана 10 га сена, 15 га сэрадэлі. Такое-ж становішча і ў іншых калгасах.

РАЙШТАБ.

ТОЛЬКІ 50 ПРОЦ. БУЛЬБЫ ЎБРАЛІ КАЛГАСЫ БССР

ЗАСЛАЎСКІ, ЛУПАЛАЎСКІ, ЧЭРВЕНЬСКІ, КЛІЧАЎСКІ І РАГАЧОЎСКІ РАЁНЫ ГАНЕБНА АДСТАЮЦЬ.

БЯРЭЦЕ ЗА ПРЫКЛАД КАЛГАС „СЕРП І МОЛАТ“

Бульбакапалка за работай.

Даць адпор кулацкай правакацыі

Уборка бульбы па калгасах БССР на 10-га кастрычніка **выкананa ў разьмеры 50 проц.** У радзе раёнаў процант уборкі яшчэ меншы. Так, **Слуцкі раён выканаў плян у разьмеры 23,2 проц., Клічаўскі—26,3 проц., Чэрвеньскі—28 проц., Лупалаўскі—10 проц., Заслаўскі—8,5 проц.** Калі ўборка будзе так ісьці і надалей, калгасная бульба можа застацца зімаваць на полі.

Мясцовыя-ж арганізацыі раду раёнаў ня ўлічваюць гэтай небясьпекі. Вясковая грамадзкасьць да апошняга часу ня была мабілізавана вакол уборкі.

Кулакі і іх агенты агітуюць калгаснікаў супроць уборкі бульбы. Пры гэтым, ім распаўсюджваецца хлусьлівыя правакацыйныя весткі аб тым, быццам, уся бульба пойдзе ў горад, калгасам-жа нічога ня будзе пакінута. Мясцовыя арганізацыі ня ўсюды даюць належны адпор гэтай правакацыйнай кулацкай агітацыі.

Лепшым ударам па кулацкай хлусьні зьяўляецца правільнае разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў ў калгасах пры ўдзеле шырокай калгаснай масы. Плян загатовак трэба ўвязваць з разьмеркаваньнем ураджаю. Але мясцовыя арганізацыі не заўсёды карыстаюцца гэтым магутным сродкам агіт. супроць кулацкай правакацыі. У радзе месц калгаснікі яшчэ дагэтуль ня ведаюць, як будзе разьмеркаваны ўраджай і што яны атрымаюць. У дадатак некаторыя раўвыканкомы парушаюць дырэктывы аб вызначаных нормах абсяжа і бульбазагатовак для калгасаў. **Такія выпадкі трэба ліквідаваць да рэшты.**

Мясцовыя арганізацыі, мабілізуючы ўсе сілы на дапамогу калгасам ва ўборцы бульбы, **абавязаны таксама растлумачыць калгаснікам, як будзе разьмеркаваны ўраджай і прыбытак у калгасах.**

Трэба азнаёміць насельніцтва з прэміямі за пасьпяховую ўборку.

„Серп і Молат“ КАНЧАЕ УБОРКУ

ГЛУСК. (Наш спец. кар.). Калгас «Серп і Молат» паказвае сапраўды ўдарныя тэмпы ў справе ўборкі бульбы. З 37 гэкт. засталося ўбраць толькі —2. Гэтымі днямі ўборка будзе скончана.

У калгасе ёсьць 32 сям'і. Самі яны-б ніколі не ўправіліся з уборкай. Старшыня калгасу склікаў сход калгаснікаў, на якім падкрэсьліў, што патрэбны рашучыя меры, бо інакш бульба можа застацца зімаваць у полі. Сход аднагалосна пастанавіў прыцягнуць да ўборкі адзінаасобнікаў. КАБ ЗААХВОЦІЦЬ ВАКОЛЬНАЕ СЯЛЯНСТВА, КАЛГАСЬНІКІ ПАСТАНАВІЛІ АДДАЦЬ СВАЕ ПРАМТАВАРЫ, АТРЫМАНЫЯ Ў ЯКАСЬЦІ ПРЭМІЯ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК, НА ПРЭМІЯВАНЬНЕ СЯЛЯН, ЯКІЯ БУДУЦЬ ДАПАМАГАЦЬ КАЛГАСУ КАПАЦЬ БУЛЬБУ. У РЭЗУЛЬТАЦЕ—БУЛЬБА АМАЛЬ УСЯ ВЫКАПАНА.

Старшыня райвыканкому загадаў выдаць калгасу прамтавары з фонду прэміяваньня за капаньне бульбы.

Працоўная дысцыпліна ў калгасе на належнай вышыні. Калгас поўнасьцю выканаў заданьне па збожжазагатоўках, дзякуючы ўзорнай рабоце калгаснікаў; у калгас нядаўна ўступіла яшчэ 17 гаспадарак.

700 га НЯ УБРАНА

РАГАЧОЎ. (Ад нашага спэцыяльнага кар.). У Рагачоўскім раёне на сёньнішні дзень па калгасах і саўгасах яшчэ ня ўбрана 700 гэкт. бульбы. Ёсьць калгасы, у якіх яшчэ ня ўбрана па 40-50 га. Грамадзкасьць незыстарчальна мабілізавана на ўборку бульбы. Нават газэта «Камунар», якая выходзіць у Рагачове, не зьмясьціла ніводнага радка пакоп уборкі бульбы.

Замест 20 вагонаў у дзень адгружана 1-2 вагоны. Мясцовыя загатоўчыя арганізацыі часта самі зрываюць адгрузку. Напрыклад, 2-га кастрычніка на ст. Рагачоў прыбыла 2.000 фурманак бульбы з Кармянскага раёну. Загатоўшчыкі былі захоплены зьнянацку, бо не падрыхтаваліся да прыемкі. На ст. прыёмка рабілася ў адным месцы па двух вагах. Толькі, дзякуючы ўмяшанню нам. Наркамгандлю **т. Абрамсона,** які зараз у Рагачове, былі ўжыты тэрміновыя меры, каб адгрузць бульбу. А так сялянам давялося-б заначаваць у Рагачове.

Чыгунка не падрыхтавалася да асеньніх перавозак. Рад пляцформ, дзе-б можна было зрабіць прыёмку бульбы, заняты грузамі, якія ляжаць па некалькі месяцаў. Ёсьць выпадкі, калі вагоны з таварамі ня выгружаюцца па 20-25 дзён.

Вёска Галынец дапамагае калгасу „Камінтэрн“

КЛІМАВІЧЫ, 12 (ПА ТЭЛЕГРАФУ). УСЯ В. ГАЛАНЕЦ ВЫЙШЛА НА ДАПАМОГУ КАЛГАСУ «КАМІНТЭРН» КАПАЦЬ БУЛЬБУ. СЯЛЯНЕ АДМОВІЛІСЯ АД ПЛАТЫ, ВЫКЛІКАЛІ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ІНШЫЯ ВЁСКІ.

Прафінтэрнаўцы выехалі на дапамогу

БАРЫСАЎ, 12. (ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШ. КАР.). 45 РАБОЧЫХ ФАБРЫКІ «ПРАФІНТЭРН» І 17 ЖОНАК РАБОЧЫХ ДОБРААХВОТНА ПАЕХАЛІ Ў КАЛГАСЫ ПАДШЭФНАГА СЕЛЬСАВЕТУ, КАБ ДАПАМАГЧЫ ІМ УБРАЦЬ БУЛЬБУ. РАБОЧЫЯ АДПРАЦОЎЦЬ Ў КАЛГАСЕ СВОЙ ДЗЕНЬ АДПАЧЫНКУ.

Пленум хутарскага сельсавету вышаў капаць бульбу

ЧЭРВЕНЬ, 12. (Па тэлеграфу). ВА ЎСІХ СЕЛЬСАВЕТАХ РАЁНУ АРГАНІЗАВАНЫ І ПРЫСТУПІЛІ ДА РАБОТЫ СЕЛЬСКІЯ ШТАБЫ ПРАВЕРКІ. ПЛЕНУМ ХУТАРСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, АКТЫЎ ГРАБЯНЕЦКАГА І ЛЯБЕЖНАГА СЕЛЬСАВЕТАЎ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНЫМІ ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ І КАПАНЬНЯ БУЛЬБЫ Ў КАЛГАСАХ. З Чэрвеня дадаткова выехалі ў калгасы 150 чал. Учора Н-скі стралковы полк вышаў у вытворча-бытавы паход па аказаньні дапамогі калгасам. Рабочыя ф-кі «Праца» ў дзень адпачынку вышлі капаць бульбу ў падшэфны калгас «Камінтэрн».

РАЙШТАБ.

РЭДКАЛЕГІІ І РАБКОРЫ

запрашаюцца 14 кастрычніка 1930 г. а 7 гадзіне ўвечары ў рэдакцыю газ. „ЗЬВЯЗДА“

на ІНСТРУКЦЫЙНУЮ НАРАДУ

ПА ПЫТАНЬНЯХ:

аб усесаюзным конкурсе на лепшае прадпрыемства; правядзеньне рэйду па праверцы рэагаваньня на заметкі рабкораў.

Рэдакцыя «Зьвязды».

Сеньня, а 12-й гадзіне дня—пасяджэньне Усебеларускага штабу генэральнай праверкі над зяб.

Чаны у заўтрашнім нумары.

Пролетарам Масквы эшалён бульбы.

Райштаб: ШПАК.

РОНЦЫ

Партыйнае будаўніцтва

ВЫКРЫВАЦЬ КУЛАЦКУЮ АГЕНТУРУ

ГНАЦЬ ЯЕ З БАЛЬШАВІЦКІХ РАДОЎ

Ад кожнай калгаснай ячэйкі партыя патрабуе бальшавіцкіх тэмпаў работы

Зьмесьці правых апартуністых з пераможнага шляху калектывізацыі

Толькі на аснове выразнага і няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі дасягнуты вялікія посьпехі на фронце сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Факт арганізацыі 230 новых калгасаў за порыва уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаній, магутны прыліў у калгасы, які вылявіўся ва ўступленьні 6.000 бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак у калектывы, выразна сьведчыць аб гэтых посьпехах.

Правыя апартуністыя, зьяўляючыся кулацкай агентурай у партыі, імкнуцца, кулаку на выгаду, падарваць калектывізацыю, прыпыніць магутную хвалю новага прыліву, падарваць калгасы з сярэдзіны. У радзе месц кулацкая агентура яўна і скрыта падрывае працоўную дысцыпліну, аказвае супраціўленьне правядзеньню важнейшых мерэпрыемстваў партыі. Допісы, якія мы сёньня зьмяшчаем, і рад матар'ялаў, зьмешчаных у «Зьвязьдзе» раней, гэта пацьвярджаюць з усёй навочнасьцю.

Гэта актывізацыя праваапартуністычных элементаў у калгасных ячэйках ПАТРАБУЕ АД ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЯШЧЭ БОЛЬШАЙ КЛЯСАВАЙ ПІЛЬНАСЬЦІ.

Партыйныя ячэйкі павінны памятаць, што найменшае паслабленьне барацьбы супроць кляснага ворага - кулака, яго агентуры—правых апартуністых—ёсьць удар па генэральнай лініі партыі. Барацьба супроць правых, супроць дэвурушнікаў і капітулянтаў павінна праводзіцца з усёй бальшавіцкай цьвёрдасьцю і настойлівасьцю. Толькі бязьлітасным змаганьнем можна расчысьціць ад правых апартуністых шлях для новага прыліву. Ня «лібэральнічаць», як гэта часамі назіраецца ў некаторых арганізацыях, а беспаваротна гнаць з кіруючых пастоў, гнаць з радоў партыі кулацкіх агэнтаў, двурушнікаў, супраціўленцаў правядзеньню лініі партыі!

Як відаць з паданых ніжэй матар'ялаў, паасобныя ячэйкі, будучы закліканымі для разгортваньня калектывізацыі, апынуліся ў палоне апартуністычнай бязьдзейнасьці. Прызнаючы фармальна правільнасьць генэральнай лініі партыі, кіраўнікі гэтых ячэек не давялі на справе, на канкрэтнай рабоце сваёй адданасьці лініі партыі. У адносінах такіх «кіраўнікоў» райкомам трэба ўжываць самыя строгія меры. Зьнімаць з работы сакратароў ячэек, ці распускаць бюро за апартуністычную бязьдзейнасьць —гэтага мала. Трэба МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАРЧОЎВАНЬНЕ ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫКІ, ПАТРАБАВАЦЬ І ДАБІЦЦА АД ЯЧЭЕК БАЛЬШАВІЦКАЙ РАБОТЫ.

Партыя будзе ня толькі самым бязьлітасным чынам выганяць са сваіх радоў апартуністых, а і змагацца з тымі, хто па-прымірэнцку адносіцца да выпазак апартуністых, хто проста ці ўкосна патурае антыпартыйнай рабоце правых і «левых» апартуністых.

Прымірэнцы

(Жыткавіцкі раён)

У калгасе імя III-га Інтэрнацыяналу рад нездаровых зьявішч. Перш за ўсё кідаецца ў вочы бесгаспадарчасьць і адсутнасьць працоўнай дысцыпліны. Стаі з яменем і яўсом мокнуць пад дажджом і гніюць. Праўленьне калгасу на працягу месяца ніяк не зьбярэцца накрыць гэтыя стагі, каб папярэдзіць псаванне збожжа.

Ячэйка і праўленьне калгасу не рэагуюць на факты грубага парушэньня працыпліны, якое выражаецца ў пяхыадзе часткі калгасьнікаў па некалькі дзён усьцяж на работу.

Калгас толькі ў канцы верасьня пачаў асеньнюю сяўбу.

Апартуністыцкую бязьдзейнасьць парт'ячэйкі і праўленьня калгасу сакратар ячэйкі Алешінскі (ён-жа старшыня праўленьня калгасу) тлумачыць пройдзі «абектыўнымі прычынамі». Аднак, калі ён-жа на сваім сходзе, пачаўшы нагадне аб становішчы калгасу, Алешінскі заявіў: «У калгасе я працаваць не магу і ня буду, рабоце, што хочаце».

Пасьля гэтага, як сход ячэйкі асудзіў апартуністычнае капітуляцтва сакратара ячэйкі, ён зноў паўтарыў сваю заяву і, нарэшце, дадаў: «апартуністым мяне называюць ня першы раз».

Паступова і райком ня ўмешваць ся у адносінах да апартуністага Алешінскага. Аб яго паводзінах своячасова паведамлена было райкому і раённай кантрольнай камісіі, але заява застанецца ня бы вынікаў. Толькі праз два тыдні райком выдумуў камісію для праверкі работы ячэйкі, але справа і па гэты дзень да канца не даведзена. Правыя кіраўнікі прымірэнцы адносяцца да адкрытых выпазак апартуністых.

П. З.

Кулацкі агент зрывае работу

У калгасе «Пралетары» працуе член партыі Паўлаў. Гэты «партыец» ня толькі не зацікаўлены тым, каб замацоўваць гаспадарчыя посьпехі калгасу, а падчас падрывае працоўную дысцыпліну, дэзарганізуе масы пры выкананьні той ці іншай задачы. Нядаўна калгасьнікі ўхвалілі ў адзін з дзён рэлігійнага сьвята працаваць з тым, каб хутчэй скончыць малацьбу. Паўлаў на толькі не падтрымаў гэтай ініцыятывы калгасьнікаў, а ўсімі сіламі імкнуўся не сарваць, зьвяўшыся да старшыні калгасу. Паўлаў з ланцкай і патрозамі пачаў патрабаваць сабе каня зьезьдзіць на кірмаш.

Гэты выпадак ня быў адзінкавым. Неяк раней, у часе гарачай работы на правядзеньні сяўбы ён замест выхаду на работу браў каня і сьдзіў на сваіх асабістых справах у горад.

У свой час Паўлаў быў некаторы перыяд сакратаром ячэйкі. Пад яго кіраўніцтвам бюро ячэйкі была вынесена пастанова, накіраваная на абарону інасьці раскулачаных кулакоў.

Буда-Канаеўскі райком замест таго, каб на гэтым канкрэтным фактце мабілізаваць партыйныя масы на барацьбу з кулацкай агентурай у партыі, яго замазаў. Мы патрабуем ад райкому партыі прыняць рашучыя меры ў адносінах да кулацкага агента Паўлава, які дэзарганізуе работу ў калгасе.

Б.

У балоце апартуністычнай бязьдзейнасьці

Пухавіцкая местачковая ячэйка стаіць у баку ад гаспадарча-палітычных кампаній, якія зараз праводзяцца на вёсцы. Загатоўкі збожжа, бульбы, мабілізацыя сродкаў насельніцтва праходзяць самацёкам. Ячэйка не мабілізавала на выкананьне гэтых задач калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі. Гэта работа праходзіць без апоры на калгасьнікаў і беднату.

Замест разгортваньня адпаведнай масавай работы сярод насельніцтва па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады», пухавіцкія галавацяпы сталі на шлях прымусовага распаўсюджаньня аблігацый пазыкі праз... сьпіртныя крамы. Ня трэба даводзіць, што «арганізатары» распаўсюджваньня пазыкі такім галавацяпскім мэтадам кампрамэтуюць ідэю пазыкі і гэтым спрыяюць зрыву не рэалізацыі.

Сярод калгасьнікаў ячэйка не праводзіла ніякай выхаваўчай работы. «Кіраўніцтва» калгасу ў асобе старшыні праўленьня Шаца ў большай меры спрыяе ўмацаваньню сярод калгасьнікаў рэлігійных настрояў, чымся палепшэньню гаспадарчага становішча калгасу.

Старшыня праўленьня калгасу Шац папярэдні яўрэйская рэлігійнага сьвята запрасіў у калгас рабіна, заразаў 16 бараноў па ўсіх правілах рэлігійнага абраду і, падзяліўшы мяса на «кашэрнае» і «трафное», задаволіў адпаведнымі гатункамі калгасьнікаў.

Гэтыя анэкдатычныя факты з жыцьця калгасу і «работы» па распаўсюджваньні пазыкі — вынік апартуністычнай бязьдзейнасьці Пухавіцкай ячэйкі.

Зараз сакратар ячэйкі Цімафэў, які апрацёўдваў сваю апартуністычную бязьдзейнасьць «перагрузкаю па службовых абавязках і хатнімі справамі», зьнята з работы.

Я. М—ка.

Апартуністы пакінуты на кіруючай рабоце

(ІОРАВІЦКІ РАЁН)

За праваапартуністычную практыку ў калгасным будаўніцтве зьняты з работы старшыня Юраўіцкага райкалгасасаюзу ЯКУНОВІЧ. Раённая кантрольная камісія гэтым не абмежавалася і вынесла яму вымову. Але праз некалькі дзён Якуновіч быў прызначаны на адказную работу ў якасьці раённага інспэктара гандлю.

Астаўленьне на адказнай рабоце апартуністага Якуновіча раённы камітэт партыі тлумачыць выключна «адсутнасьцю работнікаў, якімі можна замясьціць тую ці іншую пасаду». Такое «лібэральнічаньне» раённага парткіраўніцтва ў адносінах да правых апартуністых правялася ня толькі ў справе з Якуновічам. Работнік райза Прымак па гэты дзень застаецца на рабоце, ня гледзячы на яго апартуністычныя адносіны да правядзеньня важнейшых сельска-гаспадарчых кампаній.

М—ка.

ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА

ЗБОЖЖА ІДЗЕ НА ТЫЯ ПУНКТЫ,

—ДЗЕ РАЗГОРНУТА СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ КАЛГАСАМІ, ПАМІЖ АДЗІНАЎСОБНІКАМІ, —ДЗЕ НАЛАДЖАНЫ ЖОРСТКІ КАНТРОЛЬ НАД ВЫКАНАНЬНЕМ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ КУЛАЦКІМІ ГАСПАДАРКАМІ

ДРУГАЯ ПЯЦІДНЕЎКА СЫГНАЛІЗУЕ:

Тэмп збожжазагатовак зьнізіўся выканана толькі 12,5 проц. месячнага пляну. Вельмі дрэнна ідуць загатоўкі па індывідуальным сэктары, у хвасьце плятуцца, як і раней, саўгасы.

Тэмпы зьнізіліся

Кастрычнік зьяўляецца рашаючым месяцам збожжазагатовак. Гэты месяц павінен даць збожжа ў 2 з палов. разы больш, чымся верасень. Між сым, апошняя зводка Наркамгандлю БССР аб ходзе збожжазагатовак за другую пяцідзёўку кастрычніка паказвае ганебнае зьніжэньне тэмпаў. За гэтую пяцідзёўку загатоўка збожжапрадуктаў складае толькі 12,5 процантаў месячнага пляну. У параўнаньні з загатоўкамі папярэдняй пяцідзёўкі другая пяцідзёўка дала зьніжэньне на 14 проц.

Такое зьніжэньне тэмпаў збожжазагатовак зьяўляецца вынікам бездаказных адносін да сваіх абавязкаў з боку раду загатоўчых арганізацый.

Асабліва дрэнна ідуць загатоўкі па лініі спажывецкай кааперацыі. За другую пяцідзёўку спажыўкааперацыя зьнізіла загатоўкі на 27 проц. Загатоўлена толькі 11,9 проц. месячнага пляну.

Калгасы, праўда, далі павялічэньне, у параўнаньні з папярэдняй пяцідзёўкай, аднак і гэтае павялічэньне не пакрывае прарываў. Загатоўлена 16,6 проц. месячнага пляну (у першую пяцідзёўку было загатоўлена 8,2 проц.).

Загатоўка па саўгасах БССР ідзе, як і раней, падзвычай марудна. За другую пяцідзёўку саўгасы далі 4,8 проц. свайго месячнага пляну.

Трэба ўжыць рашучыя меры для ўзмаўненьня тэмпаў збожжазагатовак. Тых, хто зрывае гэтую важнейшую кампанію, трэба прыцягнуць да адказнасьці.

С. Г.

НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР АДСТАЮЧЫЯ КАЛГАСЫ

Усім праўленьням калгасаў, райкалгасасаюзам і райкалгасасэкцыям

Праверка выкананьня збожжазагатовак у калгасах выявіла 3 галоўныя недахопы:

1. ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК, АСАБЛІВА ПА ЗДАЧЫ ТАВАРНЫХ ЛІШКАЎ, ВЫКОНВАЕЦЦА ВЕЛЬМІ МАРУДНА.

2. ЗБОЖЖА ПАСТУПАЕ НА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎЧЫЯ ПУНКТЫ СА ЗНАЧНА ПАВЫШАНАЙ ВІЛЬГОТНАСЬЦЮ, У ВЫНІКУ ЧАГО ЯНО ХУТКА ПСУЕЦЦА І НЕЛЬЗЯ ЯГО ДОЎГА ЗАХОЎВАЦЬ.

3. Па радзе раёнаў пляны збожжазагатовак калгасаў не падзяляюцца на абавязковую здачу і здачу таварных лішкаў у добраахвотным парадку; прычым, гэтыя заданьні у некалькі раз павялічаны, або зьменшаны, параўнальна з заданьнямі округ. Напрыклад, Лагойскі райкалгасасаюз устанавіў плян збожжазагатовак для калгасаў у разьмеры 626 тон, без падзяленьня на абавязковую і добраахвотную здачу таварных лішкаў, тым часам як пляннае заданьне было на 270 тон (165 тон абавязковай здачы і 105 тон таварных лішкаў). У гэтым-жа раёне плян збожжазагатовак па індывідуальным сэктары зацьверджаны ў разьмеры ўсяго 566 тон.

Падобныя зьявішчы назіраюцца па радзе раёнаў.

Для зьнішчэньня паказаных недахопаў праўленьне Белкалгасцэнтру абавязвае праўленьні калгасаў, райкалгасасаюзаў і райкалгасасэкцый правесьці наступнае:

1. НЕАДКЛАДНА ПРАВЕРЫЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЗАГАТОВАК КАЛГАСАМІ І ПРАВЕСЬЦІ ШЫРОКУЮ РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАБОТУ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ АБ ТЭРМІНОВАЙ ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА. ПАВЕСЬЦІ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ З КУЛАЦКІМ УПЛЫВАМ, НАКІРАВАНЫМ НА ТОЕ, КАБ ЗАТРЫМАЦЬ СВАЯЧАСОВУЮ ЗДАЧУ КАЛГАСАМІ ТАВАРНЫХ ЛІШКАЎ, ДАБІЦЦА ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ КАЛГАСАМІ ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК НА ПРАЦЯГУ БЛІЖЭЙШЫХ 2-3 ПЯЦІДНЁВАК. Тых кіраўнікоў калгасаў, якія затрымліваюць выкананьне пляну збожжазагатовак, трэба безадкладна прыцягваць да адказнасьці.

2. РАШУЧА СПЫНІЦЬ ЗДАЧУ ЗБОЖЖА З ПАВЫШАНАЙ ВІЛЬГОТНАСЬЦЮ. Збожжа абавязкова прасушваць, скарыстоўваючы для гэтага ўсе мясцовыя магчымасьці. Кожнаму калгасьніку трэба зразумець, што рабочая клясма мае права атрымаць ад калгасьнікаў зусім добраякасны хлеб.

3. Безадкладна праверыць наколькі правільна дадзены заданьні кожнаму калгасу па абавязковай здачы збожжа (ня звыш 1/6 вапавога ўраджаю), а таксама па здачы калгасамі і калгасьнікамі сваіх таварных лішкаў збожжа ў добраахвотным парадку.

Белкалгасцэнтр папярэджвае, што пры выкананьні пляну збожжазагатовак трэба абавязкова прадугледзіць забесьпячэньне жывёлы кармамі, асабліва па спэцыялізаваных калгасах.

Праўленьне Белкалгасцэнтру зварачае ўвагу ўсіх калгасьнікаў і раённых калгасных саюзаў на тое, што У КОЖНЫМ РАЁНЕ ШМАТ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ ДА ГЭТАГА ЧАСУ ЎЖО ВЫКАНАЛІ СВАЕ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ І РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ ПА ЗДАЧЫ СВАІХ ТАВАРНЫХ ЛІШКАЎ ЗБОЖЖА. ГЭТЫЯ КАЛГАСЫ АБАВЯЗАНЫ ЎЗЯЦЬ НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР АДСТАЮЧЫЯ КАЛГАСЫ І ДАПАМАГЧЫ АПОШНІМ АБМАЛАЦІЦЬ І ЗДАЦЬ ЛІШКІ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ.

Старшыня праўленьня Белкалгасцэнтру БССР

О. МІЦЬКОЎ.

Спыніць крывавы фашысцкі тэрор у Зах. Украіне

ПАТРАБУЮЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ БССР

У адказ на зьверствы польскай паліцэйшчыны ў Зах. Украіне працоўныя БССР узмацняюць рады МОПР'у, абароназдольнасьць краю, узмацняюць наступленьне на фронце барацьбы за сацыялізм

Карта фашыстых будзе біта

Агульны сход ударнікаў-асьветнікаў г. Менску з вялікім абурэньнем пратэстуе супроць нячуванага крывавага разгулу фашысцкіх банд у Заходняй Украіне.

Сход адзначае, што той крывавы тэрор, тыя сярэднявяковыя жудасныя мэтады, пры дапамозе якіх польскі фашызм мяркуе задушыць рэвалюцыйны рух працоўных мас Заходняй Украіны, маюць адну мэту — падрыхтоўку нападу на СССР.

Але фашыстыя памыляюцца! Ніякімі сродкамі ім ня спыніць размаху колы гісторыі.

На разгром украінскіх грамадзкіх, культурна-асьветных і школьных арганізацый, на арышты, пагромы, пасылку карных атрадаў, на стальшінска-мураўёўскія мэтады расправы польскіх паноў над рабочымі і працоўным сялянствам Зах. Украіны мы — асьветнікі-ударнікі г. Менску, адказваем узмацненьнем работы на культурным фронце для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

Мы заклікаем пралетарыят усяго сьвету ўзьняць свой рашучы голас пратэсту супроць разгулу белага тэрору ў Зах. Украіне.

Наша брацкае прывітаньне працоўным масам Зах. Украіны, Зах. Беларусі і Польшчы, якія вядуць барацьбу за агульныя справы працоўных усяго сьвету — за перамогу пралетарскай рэвалюцыі!

***

Агульны сход рабочых заводу «Дравапрацоўшчык» рашуча пратэстуе супроць усеукраінскага пагрому, арганізаванага польскім фашызмам.

Рабочыя заклікаюць працоўныя масы Зах. Украіны і Зах. Беларусі і Польшчы яшчэ шчыльней згуртавацца вакол камуністычнай партыі для канчатковага зьвяжэньня польскага фашызму.

Рабочыя заводу абяцаюць яшчэ з большым энтузіязмам і напружаньнем усіх сіл узяцца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну за ўдарным самастойным гаспадарчым квартале.

***

— Студэнты беларускага Дэяржаўнага Будаўнічага Інстытуту, разам з навуковымі працаўнікамі, пратэстуюць супроць карных экспэдыцый і разгрому культурна-асьветных арганізацый у Зах. Украіне.

У адказ на разгул белага тэрору ў Зах. Украіне студэнты ўносяць адзін процант месячнай пэнсіі на карысьць МОПР'у і адзін проц. на пабудову дырыжабля імя Варашылава. Студэнцтва абяцае намагчы ўсе сілы для выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Фашысцкая Польшча ў ціскох эканамічнага крызісу

Фашысцкая Польшча корчыцца зараз у канвульсіях эканамічнага крызісу які перарастае ў крызіс палітычны. Недарма орган віцэ-ці «Газэта Варшаўска» піша, што Польшча перажывае зараз «найвялікшыя беды ад часу атрыманьня незалежнасьці». Нават сам маршал Пілсудзкі ў адным са сваіх апошніх інтэрв'ю прымушаны быў адкінуць у бок казённае славалоўе аб «росквіце» і прызнаць цяжкое эканамічнае становішча краю.

Але польскі фашызм ня хоча называць рэчы іх уласнымі імёнамі. Як на прычыну катастрафічнага гаспадарчага становішча Польшчы, ён спасылаецца на сусьветна-гаспадарчы крызіс, а таксама і на тое, што і ў іншых краёх ня лепш, чым у Польшчы. Уся фальш такога цьвярджэньня польскага фашызму відаць ужо з аднаго толькі параўнаньня паказальнікаў стану прамысловай прадукцыі ў Польшчы і ў вялікіх капіталістычных дзяржавах, якія перажываюць зараз асабліва вострыя эканамічны крызіс, як Амэрыка, Англія, Нямеччына. І вось, калі ўзяць за аснову стан прадукцыі 1928 году, году высокае кан'юнктуры, і лічыць стан прадукцыі гэтага году за 100, дык паводле статыстычнага Бюлетэня Лігі Нацыі паказальнікі прадукцыі для Амэрыкі ў чэрвені месяцы 1930 г. будуць роўна 90,1, для Канады—97,2, Англіі—98, Нямеччыны—85,7, Швэцыі—111,8, Францыі 113,4 і для Польшчы—79,5.

Адгэтуль, прадукцыя ў фашысцкай Польшчы ў чэрвені 1930 г., пры параўнаньні з 1928 годам, зьнізілася больш, як на 20 проц., чаго не назіраецца ні ў адной капіталістычнай дзяржаве. Значыць, віна тут ня ў сусьветным крызісе.

Мы ня раз ужо адзначалі, што ў фашысцкай Польшчы няма тэй галіны прамысловасьці, за выключэньнем ваеннай, якая-б ня была ахоплена цяжкім эканамічным крызісам. Як падае «Газэта Варшаўска», усе галіны прамысловасьці паказваюць зараз каля 25 проц. зьніжэньня прадукцыі. Платная здольнасьць насельніцтва так зьменшылася, што за два месяцы бягучага году—у красавіку і маі паступіла на 45 млн. злотых падаткаў менш, чым за тыя самыя месяцы мінулага году, а ў верасьні бягучага году—на 29 млн. менш, чым у верасьні мінулага году. Падатковая запазычанасьць з 239 млн. у 1927 г. вырасла да 414 млн. у 1929 г., ня гледзячы на тое, што падаткі спаганяюцца з нябывалай жорсткасьцю. Так, за няўплату падаткаў у сяляні, акрамя штрафаў, забіраюць апошнія хатнія рэчы і апошнюю жывёлу. Як падае тая-ж «Газэта Варшаўска», з 1928 на 1930 г. за несвячасовую ўплату падаткаў было накладзена 58 млн. злотых штрафу, а ў сапраўднасьці спагнана 128 млн. У 1926-27 г. насельніцтва Польшчы выплаціла 2 мільярды 133 млн. злотых дзяржаўных падаткаў і 485 млн. падаткаў у самаўрады—ўсяго 2 мільярды 600 мільёнаў злотых. У 1929-30 г., на гледзячы на цяжкое гаспадарчае становішча краю, насельніцтва прымушана было выплаціць 3 мільярды дзяржаўных падаткаў і 1 мільярд 300 мільёнаў злотых падаткаў самаўрадавых. Гэта значыць на 1 мільярд 700 мільёнаў злотых больш, чым у мінулыя гады.

За апошнія часы адбыўся значны адплыў польскага золата за граніцу. Толькі за адзін апошні тыдзень паводле даных Польскага банку ад 30 верасьня польскі банк прадаў на 141.620.000 злотых золата для набыцьця замежных валют. 20 верасьня 1930 г. залаты запас у Польшчы раўняўся 703 млн. злотым, а зараз—561 млн., г. зн., што запасы золата зьменшыліся на 20 проц. Трэба адзначыць, што адплыў польскага золата за граніцу ня мае выпадковага характару, а адбываецца стала і з кожным годам павялічваецца. Так, як падае «Кур'ер Пазнанскі», запас золата, валюты і дэвіз у 1927 г. раўняўся 1 мільярду 414 мільён. злотых, у 28-г.—1.335 млн. злотых, у 29 годзе—1.227 млн. злотых і зараз—998. млн. 965 тыс. злотых. Газэта зазначае, што па працягу апошніх двух год запасы золата, дэвіз і валют зьменшыліся амаль на трэцюю часьць.

Надзвычайна яскравым доказам эканамічнага крызісу і застою ў прамысловасьці краю зьяўляецца стан пратэсту вэксалёў. Так, паводле падлічэньняў Галоўнай Статыстычнай Управы за 8 месяц 1930 г. усяго было апратэставана 3.086.339 вэксалёў на агульную суму 920 млн. злотых.

У сувязі з цяжкім эканамічным крызісам будаўнічы рух у Польшчы зьменшыўся на 50 проц., з прычыны чаго цяжкі крызіс перажывае і керамічная прамысловасьць. Прадукцыя усіх галінаў Польшчы ў бягучым годзе склала толькі 25 проц. прапускной іх здольнасьці і была на 60 проц. меншай, чым у мінулым годзе. Адпавядасова цэны на цэгду сталі ніжэй сабекошту і даходзяць да 50-70 злотых на тысячу. На Паморыі прадукцыя цэглы дасягала 70% прадукцыі мінулага году, у Познанскім-жа ваяводзтве толькі 15 проц., у Верхняй Сілезіі палова ўсіх цагелень, якія дзейнічалі летась, зараз закрытыя. У такім-жа становішчы знаходзяцца цагельні і ў іншых округах.

Для падтрыманьня руху будаўніцтва нават у цяперашніх яго невялікіх разьмерах патрэбна, паводле буржуазнага польскага друку, 200-300 млн. крэдытаў ад ураду, аб чым зараз ня можа быць нават і гутаркі.

Для ацэнкі цяперашняга гаспадарчага становішча і гаспадарчых магчымасьцей фашысцкае Польшчы надзвычай характэрным зьяўляецца наступны факт. Яшчэ з 1918 г. вядомы амэрыканскі аўтамабільны король Форд меў намер пабудаваць у Польшчы вялікі аўтамабільны завод. Зараз, з прычыны няўпэўнай палітычнай сітуацыі ў Польшчы, Форд ня хоча рызыкаваць і стаіць пад пагрозу свае капіталы і ад пабудовы заводу адмовіўся. Такі завод Форд будзе зараз у Кёльне, у Нямеччыне. З Польшчай-жа вядуцца перагаворы аб пабудове толькі фабрыкі па зборы гатовых ужо часьцей аўтамабіляў.

Але польскаму фашызму, які вядзе шалёную падрыхтоўку да ўзброенага нападу на СССР, да зарэду патрэбны замежныя крэдыты. Таму ён лезе з скуры, абы толькі давесьці, што гаспадарчае становішча Польшчы ня горшае, чым у іншай капіталістычнай дзяржаве, што крызіс ідзе на ўбыль, што беспрацоўе зьмяншаецца. Для дасягненьня сваёй мэты—атрыманьня заграніччных крэдытаў, польскі фашызм ня спыняецца нават перад фальшаваньнем свайго бюджэту. Так, сацыял-фашысцкі «Роботнік» у адным з апошніх нумароў падае такі факт: пошта за 4 месяцы мела 168.000 злотых недабору і з гэта недабору ўмудрылась ўнесьці ў дзяржаўную касу 7 млн. злотых прыбытку.

Усім вядома таксама, што дзяржаўныя чынгукі ў Польшчы прыносяць толькі страту. А між тым, міністэрства Шляхоў Зносін упісла ў дзяржаўную касу 5 млн. злотых, як прыбытак ад чынгук. Мімавольна паўстае пытаньне, як усё гэта робіцца, што прадпрыемства, якое ў сапраўднасьці прыносіць дзяржаве страты, з тэтых страт умудраецца ўносіць у дзяржаўную скарбніцу мільённыя прыбыткі. Сапраўды новае «цуда».

І вось далей той-жа «Роботнік» высьвятляе гэтае новае, невядома якое ўжо на ліку «цуда» фашысцкага ўраду. Так міністэрства Пошт і Тэлеграфу прадало будаўляныя матар'ялы, загатоўленыя раней, і выручаную суму запрыходавала, як даход ад пошт і тэлеграфу. Міністэрства Шляхоў Зносін атрыманую пазыку з дзяржаўных зваротных сродкаў вярнула дзяржаве не як пазыку, а як даход. Таму нават сацыял-фашысцкі «Роботнік» робіць слушную заўвагу, што такім спосабам можна дасягнуць мільённых даходаў, прадаўшы, напрыклад, частку дзяржаўных будынкаў нават за палову іх вартасьці.

Вось меры і сродкі, пры дапамозе якіх польскі фашызм латае свой бюджэт, абы толькі паказаць за граніцай, што гаспадарчае становішча яго паляпшаецца, каб толькі атрымаць крэдыты. Трэба адзначыць, што эканамічны крызіс у фашысцкай Польшчы носіць больш вострыя формы і больш глыбокі, чым падае нават буржуазная польская преса.

С. Ж.

Пастанова прэзыдыуму ЦВК БССР

аб перавыбарах саветаў, скліканьні раённых зьездаў саветаў і X Усебеларускага зьезду саветаў

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, на падставе пастановы Прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР за 26 верасьня 1930 г., пастанаўляе:

1. X Усебеларускі Зьезд Саветаў склікаць 20 лютага 1931 году ў Менску.

2. Чарговыя перавыбары саветаў правесьці: а) сельскіх і местачковых саветаў—у працягу сьнежня 1930 г.; б) Менскага, Віцебскага і Гомельскага гарадзкіх саветаў з 10 студзеня па 10 лютага 1931 г.; в) іншых гарадзкіх саветаў—у працягу студзеня 1931 году.

3. Раённыя зьезды Саветаў правесьці ў пэрыяд з 1-га студзеня па 15 лютага 1931 году.

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

В. А. Сакратара ЦВК БССР А. РАГАЧЭЎСКІ.

12 кастрычніка 1930г.

Менск.

Украінскі пагром у Зах. Украіне

Далейшы разгром украінскіх культурнаасьветных устаноў

Ня гледзячы на запаўненьні фашысцкае ўлады, што карныя экспэдыцыі спынены, масавыя вобыскі і арышты ў Зах. Украіне працягваюцца. Так, як падае цвар афіцыёз «Газэта Польска», павальныя вобыскі ва украінскіх культурна-асьветных арганізацыях «Рідна хата» на абшарах Холмшчыны адбываюцца далей. Асабліва старанна абшукваюцца паліцыяй філіялы гэтай арганізацыі ў Грубяшоўскім і Тамашоўскім паветах. У выніку — зноў маса арыштаваных, у ліку якіх знаходзіцца б. посол Сьмялэк.

Ноччу 10 кастрычніка паліцыяй праведзены вобыскі ў памяшканьні «Украінскага дабрачыннага камітэту» ў Львове, а таксама і ў членаў гэтага камітэту. Адначасова праведзены вобыскі і ва украінскай бібліятэцы «Ідмарог». Паліцыяй забрана ўся перапіска гэтых устаноў.

«Газэта Польска» зазначае пры гэтым, што «Украінскі дабрачынны камітэт» існуе нелегальна і утварыўся замест распушчанага раней «Камітэту дапамогі палітвязьням», усе дзейнасьць якога зводзілася да аказаньня дапамогі выключна зьняволеным членам украінскай вайсковай арганізацыі. Гэта заўвага фашысцкага афіцыёзу сьведчыць аб тым, што польскі фашызм пасьля разгрому украінскіх культурна-асьветных, каапэрацыйных, спартыўных арганізацый прыступае зараз да ліквідацыі і дабрачынных арганізацый.

У Тарнопалі зноў арыштаваны некалькі украінскіх вучняў па абвінавачаньні ў падпале панскіх маёнткаў.

Кампанія масавых вобыскаў і арыштаў перакінулася зараз і на Валынь. Так, ноччу 11 кастрычніка адбыліся масавыя вобыскі сярод украінскага сялянства ў паветах Саракоўскім і Любамельскім. У першым — арыштавана 16 чалавек, а ў другім — 11 па абвінавачаньні ў камуністычнай дзейнасьці.

Аднак, ня гледзячы на ўсе рэпрэсіі і карныя экспэдыцыі фашысцкага ўраду, панскія маёнткі паранейшаму гараць. 10 кастрычніка ў фальварку Сарніках, Львоўскага павету, спалена два стагі жыта, а ў вёсцы Бандакі, Перамыскага павету, тэй-жа ноччу спалены ўсе будынкі асадніка разам з сабраным ураджаем.

Катаржны прысуд над рэвалюцыйнымі рабочымі

ВАРШАВА, 11. Люблінскі суд прыгаварыў 9 падсудных, якія абвінавачваюцца ў камуністычнай дзейнасьці, да турэмнага зьняволеньня на тэрміны ад 2 да 7 год. (ТАСС)

ПАД БОТАМ РУМЫНСКІХ БАЯР

Масавыя арышты рабочых і сялян

ВЕНА, 11. Паводле вестак з Бухарэсту, 8-га кастрычніка ПА ЎСЁЙ БЭСАРАБІІ ЗРОБЛЕНЫ МАСАВЫЯ АРЫШТЫ. АРЫШТАВАНА ЗВЫШ 100 РАБОЧЫХ І СЯЛЯН. У сваім паведамленьні з прычыны арыштаў, румынская охранка сьцьвярджае, што арыштаваныя былі актыўнымі работнікамі падпольнай камуністычнай арганізацыі, якая мела цэнтрам Татарбуранны—ачаг сялянскага паўстаньня ў Паўднёвай Бэсарабіі ў 1924 годзе.

Румынскі пралетарыят рыхтуецца да 13-й гадавіны Кастрычніка

ВЕНА, 4-га кастрычніка ў Чарновіцах (Румынія) адбыўся першы адкрыты масавы сход рабочых, які меў характар падрыхтоўчага агляду румынскага пралетарыяту да 13-й гадавіны Кастрычніка ў СССР. Паліцыя нэпала на сход і арыштавала 12 рабочых. Паліцыя робіць аблавы і масавыя вобыскі ў пагоні за адшуканьнем «камуністычнай літ...»

Сяляне аказваюць узброенае супраціўленьне жандармэрыі

ВЕНА, 11. Як падаюць з Бухарэсту, 7 кастрычніка ў вёсцы ТАЛОШЦІ ў ДАЛІНЕ МУРЭША пачаліся сялянскія хваляваньні. У вёску зьявіўся атрад жандараў для вопісі маемасьці некалькіх сялян за няўплату падаткаў. Сяляне аказалі ўзброенае супраціўленьне. Адзін жандар быў паранены і абязброены, іншыя паўцякалі. Толькі на заўтра жандарам удалося вызваліць параненага жандара і зрабіць арышты сярод сялян. (ТАСС).

ПАРЫЖ, 6 кастрычніка. Як пазае «Журналь дэ-Дэба», падмокдзячая паездка французкага міністра гандлю Фландэна па Усходняй Эўропе мае мэтай «наведваньне камэрцыйных прадстаўніцтваў, устаноўленых пры дыпляматычных місіях». Фландэн наведае Вену, Будапэшт, Белград, Бухарэст, Анкару, Софію і Атэны. Фландэн будзе мець гутарку з міністрамі гандлю ўпамянутых краёў на пытаньнях пераходу для надыходзячай эканамічнай канфэрэнцыі ў Жэневе. Французкі міністар спраўды выступае імённа ў ролі таго «міжнароднага комі-вояжэра», каторы, як пісаў польскі палітык Раман Дмоўскі, дабіваецца ажыцьцяўленьня сваіх карыслівых мэт пры дапамозе чужых сродкаў і ў імя чужых інтарэсаў.

„Міжнародны комі-вояжэр" — за работай

Грэцкія рабочыя выкрываюць сэнс Балканскай канфэрэнцыі —новай антысавецкай „затеі"

АТЭНЫ, 10. На канфэрэнцыі балканскіх д

Трывожны сыгнал з „Чырвонага Мэталістага“

Зрываецца праграма ўдарнага кварталу

Абураючыя факты няўвязкі работы паасобных цэхаў

Чаму маўчаць ударнікі? Дзе заводзкія „сквозные“ брыгады?

Калі завод уключыцца ва ўсесаюзны конкурс?

Энтузіязм спаткаў глухую сьцяну

Адозва ЦК УсеКП(б) ад 3-га верасьня выклікала но «Чырвоным Мэталістам» новую хвалю творчай ініцыятывы рабочых. У адказ на гэту адозву ў агульназаводзкай газэце «Мэтпромавец» з нумара ў нумар друкуюцца десяткі выклікаў рабочых-ударнікаў, якія на аснове далейшага павышэньня прадукцыйнасьці працы, не памяншаючы свайго заработку, зьніжаюць расцэнкі на 10, 20, 30 і ў некаторых выпадках нават на 50-60 проц. Так, зборшчыкі лябёдак т.т. **Камандзіраў і Фокін** зьнізілі расцэнкі па зборцы лябёдак з 5 да 2 руб., а т.т. **Буевіч і Батнікаў** на гэтую-ж работу зьнізілі з 5 да 2½ руб.

У выніку гэтага ўздыму, завод у верасьні ня толькі выканаў сваю праграму, але за лік не **перавыкананьня** вдолеў часткова пакрыць гадавы прарыў, які адарыўся ў выніку нявартай работы заводзкага трыкутніка. Так, калі за 11 месяцаў завод выканаў праграму на 91 проц., дык у верасьні гадавая праграма выканана на 93 проц.

Гэты ўздым, пры правільным гаспадарчым кіраўніцтве заводам, цэхам, зьменай і агрэгатам, бязумоўна забясьпечыў-бы ня толькі выкананьне павялічанай паводле сустрэчнага прамфінпляну праграмы ўдарнага кварталу, але за лік **перавыкананьня** прамфінпляну — **поўную ліквідацыю прарыву другога году пяцігодкі.** Аб тым, што гэта так, сьведчыць хаця-б тое, што ў верасьні завод **перавыканаў вытворчую праграму на 12 проц.**, а паасобныя цэхі, як плужны і ліцейны **поўнасьцю пакрылі прарыў за папярэднія 11 месяцаў**, ня кажучы ўжо аб тым, што плужны цэх перавыканаў гадавую праграму на 5 проц.

Лепшых—у партыю

Аб нячуваным дагэтуль уздыме творчай ініцыятывы рабочых гаворыць шчэ той факт, што ў адказ на адозву ЦК, лепшыя кваліфікаваныя рабочыя на зьлёце ўдарнікаў 30-га верасьня падалі заявы аб уступленьні ў рады нашае партыі, каб разам з партыяй і пад кіраўніцтвам яе ленінскага ЦК змагацца за выкананьне пяцігодкі—за чатыры гады, за перамогу сацыялізму ў нашай краіне. Так заяўлялі старыя кваліфікаваныя беспартыйныя рабочыя заводу т. т. Шкубэрт, Бляхман, Янкевіч, Забэла, Кавальскі і інш. А ўвесь калектыў ударнікаў на гэтым-жа зьлёце адназгодна пастанавіў выкінуць з радоў саюзу рвача-лягуна майстра тісельнага цэху Навасёлава і занесьці на чорную дошку Ціханоўскага, Нікіціна, Цыганкова, Кляменцьцева, Забяжынскага, Плаўзэвіча і Сельваненка, якія зьяўляюцца простымі вінаватымі зрыву прамфінпляну другога году пяцігодкі.

Задачай усяго трыкутніку і ў першую чаргу гаспадарчага кіраўніцтва заводам, зьяўлялася тое, каб пры дапамозе энтузіястых-рабочых падрыхтаваць кожнае паасобнае зьвяно да поўнага выкананьня прамфінпляну. Але, гэтага няма. Завод з 1-га кастрычніка мае новыя, больш глыбокія прарывы чымся ў мінулым гаспадарчым годзе.

„Очковтирательство“ кіраўнікоў

Дырэктар заводу **т. Берговін**, загадчык вытворчасьці **т. Крыгель** і загадчык плужнага цэху **т. Караўкін** на пасяджаньнях бюро калектыву заяўлялі партыйную арганізацыю і ўсю масу заводу, што, пачынаючы з 1-га кастрычніка, завод зможа ў плянавым парадку прыступіць да рэгулярнай работы па выкананьні тых задач, якія, у сувязі з караённай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі, пастаўлены перад нашым заводам. Больш таго, тав. Берговін і Крыгель запэўнялі партыйную арганізацыю, што выпрацоўка трансмісійных «точак» будзе поўнасьцю скончана і што шэйныя фабрыкі, якія зараз будуюцца, своечасова атрымаюць патрэбнае абсталяваньне ад нашага заводу.

У процілегласьць гэтаму «очковтирательству», «Мэтпромавец» біў трывогу. Так, у № 34 «Мэтпромавец», на аснове тэлеграмы Ленінградзкага, станіў пытаньне, што ў выпадку неадгрузкі Ленінграду да 23-га верасьня ўсіх дэталяй па трансмісійных «точках», завод сарве пуск да 1-га кастрычніка новай шэйнай фабрыкі ў Ленінградзе. Апрача таго, газэта ставіла пытаньне ня толькі аб ленінградзкай шэйнай фабрыцы, але аб усёй шэйнай прамысловасьці, якая павінна быць абсталявана нашым заводам.

У гэтым-жа нумары «Мэтпромаўца» ставілася пытаньне аб тым, што «наблізныя рабочыя з-за адсутнасьці шаблёну, цыркуля ці якой-небудзь іншай дробязі,

У той час, калі варштат па апрацоўцы злучальных муфт, у якіх будаўніцтва шэйных фабрык адчувае асаблівую патрэбу, ня можа спраўляцца з сваёй праграмай, мы маем такія факты, калі гэты варштат **стаіць на працягу цэлых зьмен толькі таму, што мэханічны цэх не паставіў людзей на зборку гэтых злучальных муфт.**

Будаўніцтва мае вялікую патрэбу ў нашых лябёдках. Але звыш 100 лябёдак валяюцца ў складах і на двары заводу толькі таму, што няма да іх паасобных дробных частак, як шківы, кажухі і г. д.

Паводле прамфінпляну, завод з 1-га кастрычніка павінен быў выпускаць па 13 лябёдак і 55 трансмісійных «точак» у дзень, але ўжо з першага дня мы маем прарыў. 1-га кастрычніка выпушчана 5. 3-га—11, 4-га—5, 5-га—0, 6-га—11 і 7-га—12 лябёдак. Такім чынам, мы зноў за першыя-ж дні новага гаспадарчага году не дадалі будаўніцтву **34 грузападзёмных машын.**

Няма гаспадарчага вока

Можна падумаць, што завод ня выконвае праграмы толькі таму, што ўзяў на сябе надмернае абавязацельства. Але памыліцца той, хто так падумае, бо **завод мае ўсе магчымасьці, каб ня толькі выканаць, але і перавыканаць гэтую праграму.** Справа толькі ў тым, што няма цьвёрдай гаспадарчай рукі, няма плянавасьці ў цэху. Напрыклад, для таго, каб сабраць 13 лябёдак патрэбны 26 падшыпнікаў, з якіх 13 разьмерам 50 мм у дыямэтры і 13 на 45 мм у дыямэтры. І вось, амаль кожны дзень зборшчыкі малатарань стаяць толькі таму, што такарны цэх дае новыя партыі падшыпнікаў **у 50 мм.**, у той час, калі зусім няма 45 мм. Такіх фактаў можна было-б падаць шмат.

Яшчэ горш стаіць справа ў плужным цэху, які з 1-га кастрычніка павінен быў прыступіць да вырабу новай маркі двухкорпусных плугоў сыстэмы ДТЛРМ. Плужны цэх яшчэ па сёнешні дзень мае вялікія перабоі ў сваёй работе толькі таму, што ліцейны цэх не дастаўляе яму неабходнай колькасьці ліцьця і што дагэтуль яшчэ ня зроблена патрэбная колькасьць штампаў. А ліцейны цэх сваю праграму ня выконвае таксама таму, што дагэтуль ня зроблены патрэбныя маделі.

Гэтыя непаладкі на заводзе ня вычэрпваюцца. Ліцейны цэх выпускае нябачную колькасьць браку, амаль усё ліцьцё мае ракавіны, з-за чаго прыходзіцца плаціць токарам за расточку, гнаць варштаты ўпустую і пасьля ўсяго гэтага ўсю работу пусьціць зноў у пагранку.

З-за гэтага брака мы маем штодзенна крастой ня толькі ў мэханічным цэху, дзе адбываецца зборка, але таксама і ў малярным цэху, дзе адбываецца афарбоўка.

Падзякаваць Стаякову...

Замест таго, каб змагацца з гэтымі нездаровымі зьявішчамі, член партыі **т. Стаякоў** (ён-жа член гаркому партыі) зьяўляючыся брыгадзірам 3-й зьмены такарнага цэху, таксама па нягрунтоўнай прычыне не зьявіўся на работу і тым самым ня толькі сарваў работу сваёй зьмены, але і работу ўсяго сьлясарна-зборачнага цэха. Характэрна, што Стаякоў на заметку рабкора адказаў: «Вам, як чалавеку сьвядомаму, трэба было ў сваёй нататцы мне падзяку выказаць за тое, што я асёў па вашым заводзе і дапамагаю вам выканаць прамфінплян».

Але справа ня ў адным Стаякове. Калі «Мэтпромавец» ледзь дабіўся рэагаваньня на заметкі з боку партыйных і прафэсыянальных арганізацый заводу, дык з боку адміністрацыі дагэтуль няма ніякага рэагаваньня, у выніку чаго некаторыя рабкоры зусім кідаюць пісаць.

Рэканструкцыя пад пагрозай зрыву

Наш завод у бягучым гаспадарчым годзе, у сувязі з рэканструкцыяй усяе сельскае гаспадаркі, павінен карэнным чынам перабудавацца. Замест машын для індывідуальнай гаспадаркі, мы павінны перайсьці да выпуску больш складаных машын, якія дагэтуль выраблялісь за мяжой і прызначаны для абслугоўваньня калектыўнага сэктару сельскай гаспадаркі. У сувязі з гэтым завод павінен быў да 5-га кастрычніка паслаць у Гіпрамаш усе матар'ялы, без якіх Гіпрамаш ня можа падрыхтаваць неабходнага праекту і эскізаў рэканструкцыі заводу. **Дагэтуль матар'ялы не адасланы.** Такім чынам, рэканструкцыя заводу сваячасовы выпуск новых, больш складаных машын, як трактарныя балотныя плугі, жмыхадрабілкі, кораньрэзкі і трактарныя бораны —пад пагрозай зрыву.

Усё гэта даводзіць, што на заводзе ня ўсё добра, што партыйная і прафэсыянальная арганізацыі, ня кажучы ўжо аб заводакіраўніцтве, не сталі на чале творчага ўздыму рабочай масы і не маглі накіраваць яго на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Вывады наўстаюць самі. Каб ліквідаваць гэтыя прарывы, трэба ўзмацніць гаспадарчае партыйнае і прафэсыянальнае кіраўніцтва заводам, бо за апошні час, асабліва партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі зусім паслабілі работу. У той-жа час, трэба в усёй бальшавіцкай рашучасьцю паставіць пытаньне аб вінаватых тых таварышоў, якія сваім апартуністычным кіраўніцтвам давялі завод да гэтых прарываў.

С. ШОК.

Малюнак мастака Бразэра

Ліцейшчык заводу «Энэргія» **т. Сімута**—вылучаны на пасаду пам. дырэктара па рабочых прапановах. Ён-жа —загадчык ТНБ.

Як мы зьвязаны з замежнымі рабочымі?

„ЗЬВЯЗДА“ АРГАНІЗУЕ ПЕРАКЛІЧКУ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ АБ СТАНОВІЧШЫ МІЖНАРОДНАЙ СУВЯЗІ

Да Кастрычніцкіх сьвят падагулім вынікі гэтай важнейшай галіны працы

Не забываць, што ўзмацненьне міжнароднай сувязі дапамагае выкананьню прамфінпляну і інтэрнацыянальнаму выхаваньню мас

Выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, шырокі размах калгаснага руху і ліквідацыя на гэтай базе кулацтва, як клясы, узьняцьце палітычнай актыўнасьці і творчага энтузіязму рабочае клясы, згуртаванасьць пралетарыяту навакол генэральнай лініі партыі, — зьяўляюцца найлепшымі доводамі вялізарных перамог у сацыялістычным будаўніцтве.

Гэта будаўніцтва адбываецца ва ўмовах узрастаючай ваеннай небясьпекі супроць Савецкага Саюзу — адзінай у сьвеце краіны сацыялізму — бацькаўшчыны сусьветнай рэвалюцыі.

Побач з нарастаючай нянавісьцю сусьветнай буржуазіі да СССР, побач з падрыхтоўкай новых войн — у капіталістычных краінах РАСЬЦЕ ХВАЛЯ РЭВАЛЮЦЫЯНАГА РУХУ.

У абставінах шырокага сацыялістычнага наступленьня, ва ўмовах набліжэньня новых рашучых вялізарных баёў, вялікае значэньне набывае ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ МАС, ЯК СРОДАК БАЛЬШАВІЦКАГА ЗГУРТАВАНЬНЯ СІЛ.

Гэтай справе да апошняга часу нашы арганізацыі не аддавалі тэй увагі, якой яна заслугоўвае. У момант разгорнутага сацыялістычнага наступленьня пралетарыят СССР намагае ўсе сілы на выкананьне вялікага пляну пяцігодкі.

У гэты час трэба асабліваю ўвагу зьвярнуць на арганізацыю МІЖНАРОДНАЙ РАБОЧАЙ СУВЯЗІ, у зьмест якой увойдзе паскарэньне тэмпаў будаўніцтва ў СССР, пасьпяховае выкананьне прамфінплянаў на прадпрыемствах, абарона Савецкага Саюзу ад нападу капіталістых, растлумачэньне замежным працоўным масам мірнай палітыкі Савецкага Саюзу, рэвалюцыйная арганізаванасьць пралетараў вакол кампартыі і бавых прафсаюзаў. Выкрываць хлусьню буржуазнага і сацыял-здрадніцкага друку, знаёміць з сапраўдным становішчам і ўмовамі нашага жыцьця і барацьбы, — ВОСЬ АСНОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ МІЖНАРОДНАЙ СУВЯЗІ.

Міжнародная сувязь у нас яшчэ дагэтуль разгорнута невыстарчальна. Набліжаецца 13 ГАДАВІНА КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ. Да гэтага дня трэба праверыць, ШТО ЗРОБЛЕНА АРГАНІЗАЦЫЯМІ Ў СПРАВЕ НАЛАДЖАНЬНЯ МІЖНАРОДНАЙ СУВЯЗІ. За час, які яшчэ застаўся, трэба зрабіць РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ У ГЭТЫМ НАПРАМКУ, праводзячы ва ўсіх прафсаюзных культэсьвятных сыстэматычную штодзенную работу.

У нас некалькі прадпрыемстваў з-за наўважлівых адносін сарвалі міжнародную сувязь, некаторыя, (як друкарня «Зьвязда») не адказалі нават на выклік нямецкіх друкароў.

Завод «КАМУНАР» у свой час прыняў сьцяг АД РУЛЬСКІХ РАБОЧЫХ, як адзнаку міжнароднай салідарнасьці, але на гэтым і скончылася ўся справа. На лісты з Рулы не адказваюць.

Зусім нядаўна рабочыя «ЭНЭРГІІ» завязалі сувязь з рабочымі лейпцыгскай фабрыкі «Лямпэн-Шкэйдэр». Гэта сувязь пачынае ўзмацняцца. Трэба толькі арганізаваць яе так, каб уцягнуць у гэту справу больш шырокія колы рабочых, мабілізаваць гэту сувязь на выкананьне прамфінпляну і на выкананьне тых задач, якія стаяць перад намі ў адносінах да нашых замежных таварышоў.

Заводзкі друк «Энэргіі» добра асьвятляе тую сувязь, якую энэргаўцы зусім нядаўна наладзілі з рабочымі Лейпцыга.

ДА 13 ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА НА КОЖНЫМ ПРАДПРЫЕМСТВЕ ТРЭБА РАЗГАРНУЦЬ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНУЮ РАБОТУ. Там, дзе ёсьць уже групы інтэрнацыянальнай работы, ЯНЫ ПАВІННЫ РАСКАЗАЦЬ АБ СВАЁЙ ПРАЦЫ і давесьці яе да хат-чытальень, да вясковых бібліятэк, прыцягнуўшы да гэтай справы арганізацыі МОПР'у, КАЛГАСЫ І САЎГАСЫ ПАВІННЫ СТАЦЬ НА ВЁСЦЫ БАЗАЙ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫХАВАНЬНЯ.

ПРАЛЕТАРСКІЯ ПІСЬМЕНЬНІКІ! Што зрабілі вы, каб уключыць у тэматыку мастацкай творчасьці пытаньне інтэрнацыянальнага выхаваньня мас і міжнароднай сувязі?

МОПРАЎСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ЭСПЭРАНТО-ЯЧЭЙКІ, раскажэце аб сваёй рабоце па міжнароднай сувязі.

Пры гэтым мы зварачаемся ДА ЗАМЕЖНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, якія мелі і маюць сувязь з прадпрыемствамі БССР, каб яны расказалі аб гэтай сувязі і аб тым, як яны яе выкарыстоўваюць.

7 ЛІСТАПАДА—ДЗЕНЬ ПЕРАКЛІЧКІ БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЬЦІ ПРАЛЕТАРАЎ УСІХ КРАІН ДА БОЕК ЗА СУСЬВЕТНЫ КАСТРЫЧНІК. Будзем памятаць аб нашых задачах у гэты дзень і ў справе інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Інтарэсы сусьветнай рэвалюцыі патрабуюць узмацненьня міжнароднай сувязі, нагул, і аб'яднаньня і згуртаваньня міжнароднага рабочага руху навакол першай краіны пралетарскай дыктатуры, у асаблівасьці. І ГЭТУ СУВЯЗЬ МЫ ПАВІННЫ ЎЗМАЦНІЦЬ.

Д. СЬНЯЖКО.

Правяраць кожныя дзесяць дзён

Мітынг рабочых заводу «ДРЭВААПРАЦОЎШЫК» (Менск) ухваліў пастанову аб уключэньні за ўсесаюзны конкурс. У прынятай рэзалюцыі рабочыя абяцаюць ужыць усе захады да перавыкананьня колькасных і якасных паказэльнікоў, разгарнуць рацыяналізацыю вытворчасьці (для чаго ўключыцца ва ўсесаюзную арганізацыю «Рахунак рацыяна лізацыі»); дабіцца паляпшэньня работы вытворчых нарад.

Мітынг таксама пастанавіў кожныя дзесяць дзён заслухоўваць інфармацыю аб ходзе барацьбы за першынство. «Трыкутніку» прапанавана павесіць плякат з умовамі ўсесаюзнага конкурсу.

У ПАХОД ЗА ПАПЕРУ

Узмацніць тэмпы забесьпячэньня папяровых фабрык сыравінай

ЗБОР МАКУЛАТУРЫ—НЕ КАМПАНІЯ, А СЫСТЭМАТЫЧНАЯ ШТОДЗЕННАЯ РАБОТА ЗАГАТОЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, УСЯЕ ПРАЛЕТАРСКАЕ ГРАМАДЗКАСЬЦІ

Б'ЕМ ТРЫВОГУ

Марудны тэмп збору макулатуры на БССР прымушае біць трывогу. Райштабы «У паход за паперу» ігнаруюць усе ранейшыя пастановы беларускага штабу ў галіне разгортваньня работы па зборы макулатуры. **Райштабы не адчуваюць ніякай адказнасьці за такую важную справу, як забесьпячэньне папяровых фабрык сыравінай.** Загатоўчыя пункты Белдаляргандлю і Белдаляргандаль не даюць вестак беларускаму штабу аб колькасьці макулатуры па дэкадах, ня гледзячы на частыя напамінаньні. Зусім недапушчальныя, нядбайныя адносіны да загатоўкі папяровага сырцу з боку Белкаапсаюзу.

У Беларускім штабе ёсьць весткі, што Белкаапсаюз зьбірае зараз ад Райпа застарэлыя брашуры, кнігі, сартуючы і адгружаючы іх. **Але невядома, куды накіроўвае Белкаапсаюз гэту кніжную масу? Нам невядома, ці зьяўляецца гэта кніжная маса макулатурай, а калі гэта макулатура, дык чэму невядома, куды ле Белкаапсаюз накіроўвае?** Белкаапсаюз ігнаруе беларускі штаб. Ня хоча даць вестак аб сваіх загатоўках макулатуры ў раёнах, а таксама аб устарэлай кніжнай масе.

Нядаўна беларускаму штабу давялося канстатаваць факт злачынных адносін да аьберажэньня паперы. **ЦРК забясьпечвае свае буфэты на прадпрыемствах і ўстановах г. Менску замест абвёртачнай паперы — першазгатунковай пруткай паперай (масьлёнка), якая ўжываецца на вокладкі для кніг. Адзін аркуш такой паперы каштуе 20-25 кап.** Усе спробы беларускага штабу выкрыць вінаватых у гэтым галавацяпстве натыкуліся на сьцену бюракратызму. У ЦРК ня ведаюць, хто адпускае абвёртачную паперу для буфэтаў. Белпапера абмежавалася бюракратычным адказам, што гэта не не справа. Такім чынам, дзесяткі кілё масьлёнкі зьнішчаюцца і трапляюць у яму для сьмяцьця.

Першыя выпікі вучнёўскага паходу за макулатурай па Менску нас не здавальняюць, бо гэта кропля ў моры. Першы паход праведзены навярхоўна. Яшчэ дагэтуль валяецца шмат макулатуры ва ўстановах і ў прыватных кватэрах; інакш кажучы, валяюцца дзесяткі тон сыравіны для папяровых фабрык.

Тэмпы збору макулатуры павінны быць узмоцнены. Збор макулатуры — гэта не кампанія, а штодзенная сыстэматычная работа загатоўчых арганізацый і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Яшчэ раз патрабуем ад райштабаў «У паход за паперу» і загатоўчых пунктаў разгарнуць шырокую работу па зборы макулатуры.

ЦУДЗІН.

БАБРУЙСК АДСТАЕ

Ня гледзячы на тое, што па радзе раёнаў БССР збор папяровае макулатуры шырока разгорнуты бабруйскі райштаб «У паход за паперу» моцна сьпіць.

Раённы штаб, які існуе пры газэце «Камуніст» абмежаваўся тым, што вывесіў плякаты ў горадзе, а сам адпачывае на лаўрах, спадзяецца па самацёк, што мол, макулатура сама прыдзе, ня трэба праводзіць ніякай масавай работы. З часу ліквідацыі акругі, бабруйскі райштаб ня разу не засядаў.

З-за гэткіх адносін райштабу да спаіх абавязкаў мы маем тое, што няма прыцёку макулатуры.

Зусім не ахоплена і ня прыцягнута да гэтай справы вучнёўства, настаўніцтва і піянэры, у той час, калі пры іх дапамозе можна было-б шмат зрабіць. Бабруйскае аддзяленьне Дзяржгандальбелу гэтай справай таксама ня цікавіцца.

Беларускаму штабу «У паход за паперу» трэба хутчэй прыняць меры да ажыўленьня работы ў Бабруйску па зборы папяровае макулатуры, каб не дапусьціць зрыву гэтай работы.

С. КАГАН.

Мабілізацыя сродкаў насельніцтва

У КАСТРЫЧНІКУ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫВЫ НА ЎСІХ ВУЧАСТКАХ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ

Менскі Гарсавет абвясьціў дзесяцідзёньнік ліквідацыі прарываў. Яго прыкладу абавязаны сьледваць усе раёны і гарады

БССР—толькі на пятым месцы па рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых

Паводле даных Наркамфіну СССР, Савецкая Беларусь—на ПЯТЫМ месцы ў Саюзе Савецкіх Рэспублік па рэалізацыі сярод рабочых і служачых пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады». Тымчасам, калі Туркмэнская ССР рэалізавала 115,9% заданьня, УССР і РСФСР—98,3, а Узьбекская ССР—93,3проц., па БССР рэалізавана сярод членаў прафэсыянальных саюзаў толькі 90,1 проц.

Па падпісцы неарганізаванага насельніцтва БССР на ШОСТЫМ месцы ў Саюзе рэспублік.

Наркамфін СССР, т. БРУХАНАЎ, надаслаў тэлеграму Наркамфіну БССР, у якой падкрэсьлівэецца, што кантрольнае заданьне па гарадзкім сэктары ня выканана. Апошняя дэкада дае рэзкае зьніжэньне тэмпаў рэалізацыі пазыкі сярод арганізаванага насельніцтва.

Тав. Бруханаў катэгарычна прапануе поўнасьцю выканць заданьне да 15-га кастрычніка.

Зьнізіліся тэмпы рэалізацыі пазыкі і па сялянскім сэктары, што не забясьпечвае выкананьня важнага заданьня. Зусім нездавальняюча ідзе афармленьне падпіскі.

Наркамфін СССР прапануе ўзмацніць тэмпы рэалізацыі, дабіцца мабілізацыі ўсіх сіл вакол выкананьня кантрольных лічбаў.

Прэзыдыум ЦСПСБ, за подпісам тав. АВЕРЫНА, разаслаў учора ўсім раённым прафарганізацыям тэлеграму, у якой канстатуецца невыкананьне кантрольных лічбаў пазыкі да тэрміну і прапануецца забясьпечыць да 20-га кастрычніка поўны ахоп усіх працоўных.

ТЫСЯЧЫ БУДАЎНІКОЎ НЕ АХОПЛЕНЫ ПАДПІСКАЙ

Рэалізацыя пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады» сярод будаўнікоў праходзіць вельмі дрэнна. На апошнім пасяджэньні менскай гарадзкой камісіі садзейнасьці дзяржкредыту гэта асабліва падкрэсьлівалася.

Камсоды 27 і 28 рабочкомаў Менбуду, БЖС і Галоўдартрансу зрабілі справаздачу аб ходзе рэалізацыі. Прадстаўнік ЦП саюзу будаўнікоў інфармаваў аб становішчы з падпіскай па ўсім саюзе будаўнікоў.

Што-ж мы бачым?

Паводле лічбаў ЦП саюзу будаўнікоў, на 1 кастрычніка па Менску падпіска дасягнула 221.000 руб. пры двухтыднёвым заработку ў 250.000 руб. Ахоплена па Менску падпіскай 5.237 чал. з 6.160 членаў саюзу будаўнікоў, акрамя сэзоннікаў.

Прадстаўнік вышчадкасы выправіў «лічбы» ЦП саюзу будаўнікоў і даваў, што, паводле даных гарадзкой вышчадкасы, агульная сума падпіскі па саюзе будаўнікоў дасягнула 192.000 руб., а не 221.000, або 63 проц. фонду двухтыднёвага заработку і што ахоплена не 5.237 чал., а 3.569, або 64 проц. ўсіх рабочых.

Падпіска афармлена дрэнна. Па радзе прадпрыемстваў яшчэ ня ўнесены атрыманыя ўзносы. Ніякай растлумачальнай работы сярод рабочых ЦП не праводзіла. Сэзоннікі амаль не ахоплены падпіскай. Камсод Белжылсаюзу зусім ня цікавіўся тым, як праходзіць падпіска па жэтках.

Камсоды нічога не рабілі, апрача разгляду заяў на продаж і закład аблігацый. Некаторыя камсоды (Галоўдартранс і Белжылсаюз) дазвалялі інжынэрам і бухгальтэрам прадаваць і закладваць аблігацыі для... паездкі на курорты і г. д.

Ц.

Ход мабілізацыі нездавальняючы

—сыгналізуюць рабселькоры

Дырэктывы партыі і ўраду аб мабілізацыі сродкаў насельніцтва, аб узмацненьні фінасавай базы трэцяга году пяцігодкі ўзварушылі пралетарскую грамадзкасьць.

На мясцох працуе рад брыгад, якія правяраюць ход мабілізацыі, якія падштурхоўваюць раённыя і вясковыя арганізацыі.

У рэдакцыю «Зьвязды» паступіла шмат матар'ялаў і данясеньняў брыгад, якія паказваюць, што ход мабілізацыі сродкаў дагэтуль нездавальняючы.

Пасланая ў **Крычаўскі раён** брыгада выявіла, што па ашчадняй справе па раёне нічога не робіцца. Кантрольныя лічбы ня толькі ня выкананы, але ёсьць нават адліў укладаў. Калі брыгада зьвярнулася да сакратара райкому з прапановай пасьлаць людзей у сельсаветы для ліквідацыі прарываў, сакратар адказаў, што мерапрыемствы, якія раіць брыгада — падворны абход, арганізацыя ўдарных брыгад — нічога не дадуць, і таму ён супроць іх. Так і не ўдалося нічога дабіцца.

Тав. **Вонін** паведамляе аб скрыўленьні клясавай лініі ў справе мабілізацыі сродкаў насельніцтва па **Вульскім раёне.** Матар'ялы сельсаветаў аб індывідуальным ападаткаваньні не разглядаюцца райпадатковай камісіяй больш як два месяцы. Ёсьць выпадкі зьмяншэньня падатку заможнікам. Сьпісы беднякоў, якія павінны быць вызвалены ад падатку, разглядаліся габінэтным парадкам, і таму ёсьць ападаткаваныя бядняцкія гаспадаркі. Калгасьнікі-беднякі, якія летась не плацілі падатку, зараз плацяць па 7 і больш рублёў.

Такая работа фінансавай часткі РВК грае толькі на руку кулаку і яго агентуры.

Тав. **Б. Г.** у сваёй карэспандэнцыі падкрэсьлівае неданумэльна марудны тэмп мабілізацыі сродкаў па **Бялыніцкім раёне.** Яркі прыклад—рэалізацыя пазыкі. Ашчадкаса пры заданьні ў 1.800 руб. рэалізавала на 185 руб. сярод сялян і на 385 руб. сярод служачых. Заданьне па ўкладах выканана ў разьмеры 4 проц. Ёсьць вялікія нядоімкі па страхавых узносах і с.-г. падатку.

Ня лепшы малюнак па **Рэчыцкім і Ўваравіцкім раёнах.** Згодна паведамленьня рабочай брыгады НКФ СССР, у абодвух раёнах ёсьць прарывы па асобных вучастках мабілізацыі сродкаў. Па Ўваравіцкім раёне ёсьць нядоімка па с.-г. падатку ў 2.300 руб. З налічаных у гэтым годзе 146.000 руб. паступіла толькі 44.000 руб. Яшчэ горш са страхоўкай: паступіла каля 2.000 руб.—зусім нізначны процант заданьня. Па Рэчыцкім раёне райсельбанк замест 87.000 руб. плацяжоў атрымаў толькі каля 20.000 руб. Па Ўваравіцкім раёне з 70.600 руб. паступіла 30.000 руб.

Зусім дрэнна ідзе збор паёў па спажывецкай кааперацыі—з 34.000 руб. паступіла 6.000 руб. (па Ўваравіцкім раёне).

Тав. **С. Лодысоў** у сваёй карэспандэнцыі характарызуе ход мабілізацыі ў **Мазырскім раёне.** Усе арганізацыі раёну вельмі дрэнна выконваюць дырэктывы ўраду. Нічога не зрабіў раймалжынсаюз. Вельмі дрэнна мабілізуе сродкі Мазырскі ЦРК. Апошні павінен быў сабраць у чацьвертым квартале 33.000 руб. паёў і 8.000 руб. укладаў. Фактычна паступіла толькі 38 проц. пляну. Кантрольнае заданьне па авансах на тавары выканана ў разьмеры 2.000 руб. замест 129.000 руб.

Гадавое заданьне па с.-г. падатку выканана да 1 кастрычніка на 30,8 проц. Поўны правал са страхавымі плацяжамі: павінна было паступіць 75.000 руб., паступіла 7.800 руб. У галіне самаабкладаньня ёсьць запазычанасьць з мінулага году ў суме 20.000 руб.

Тав. **Емельянаў**, брыгадзір галоўнага кіраўніцтва ашчадкамі касамі, у сваім паведамленьні рэзка абрушваецца на арганізацыі **Асіповіцкага** раёну, якія правальваюць мабілізацыю сродкаў насельніцтва. Які вучастак ня возьмеш: страхоўка, с.-г. падатак, самаабкладаньне, пазыка, уклады,—усюды сур'ёзныя прарывы, якія характарызуюць безадказныя, нядбайныя адносіны да дырэктыў вышэйшых органаў. Вось, напрыклад, трэба было ўпягнуць укладаў на 83.000 руб., уцягнута на 10.782 руб.—13 проц. Трэба было аформіць падпіску на пазыку ў разьмеры 85.500 руб., афармлена толькі 73.000 руб. Запазычанасьць па трэцяй пазыцы перавышае 3.500 руб.

Брыгадзір **Левенка** спыняецца на рабоце арганізацый **Ветнаўскага раёну.** І тут такі-ж малюнак, як і ў пералічаных раёнах. Мясцовая грамадзкасьць не згуртавана вакол кампаніі. Работа па мабілізацыі сродкаў не праводзіцца баявымі тэмпамі, назіраюцца пасыўныя, напляваўдзельскія адносіны да выкананьня задач кампаніі. Пленум РВК, напрыклад, ухваліў рад пастаноў аб мабілізацыі сродкаў; пастановы дагэтуль марыцуюцца ў папках райвыканкому. Ніякай работы не праводзіць райсельбанк. Ёсьць рад выпадкаў, калі паасобныя сельсаветы затрымліваюць узносы на пазыку. Прафэсыянальныя арганізацыі ня прымаюць удзелу ў рэалізацыі пазыкі і зборы плацяжоў. Наогул, **вывады брыгады**—становішча работы па мабілізацыі сродкаў, з-за бязьдзейнасьці пізавых арганізацый, вельмі няспрыяючае.

Аб павольнай рабоце па мабілізацыі сродкаў паведамляе і карэспандэнт тав. **А. С.** з **Талачынскага раёну.** У сваім артыкуле ён падае рад лічбаў, якія сьведчаць, што заданьне ўрада на асобных вучастках выканана ў нязначнай ступені.

* *

Дырэктывы партыі і ўраду [illegible] рычна патрабавалі ад усёй грамадзкасьці, ад усіх партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый канцэнтрацыі ўсяе ўвагі, напружаньня ўсяе энэргіі на мабілізацыю сродкаў.

Мясцовыя арганізацыі павінны ўсьвядоміць, што мабілізацыя сродкаў зьяўляецца асноўнай прадпасылкай падвядзеньня моцнай фінансавай базы нашай сацыялістычнае будаўніцтва, што без узмацненьня фінансавай базы нельга поўнасьцю вэзьцьцяніць плянавых работ трэцяга году пяцігодкі.

Толькі апартуністычнай бязьдзейнасьцю, агідными адносінамі да выкананьня дырэктыў можна тлумачыць тыя правалы ў ходзе кампаніі, аб якіх сыгналізуюць нашы карэспандэнты і брыгадзіры.

На працягу ўдарнага кварталу кастрычнік-сьнежань прарывы ў ходзе мабілізацыі павінны быць ліквідаваны.

Трэба прыняць самыя суровыя меры ў адносінах да тых, хто зрывае выкананьне важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Б.

ГАНДЛЯРЫ І ЧУЖАКІ у нізавых органах „Белмяса“ і „Белрыбы“

Разбазарваньне прадуктаў, вызначаных для рабочых цэнтраў

ЦП САЮЗУ ХАРЧАВІКОЎ ПРАПАНУЕ ВРАБОЧЫЦЬ АПАРАТ „БЕЛМЯСА“. ДЫРЭКЦЫЯ УПАРТА МАЎЧЫЦЬ.

ПАТРАБУЕМ ДАТЭРМІНОВАЙ ЧЫСТКІ АПАРАТУ „БЕЛМЯСА“ І „БЕЛРЫБЫ“

11 кастрычніка ў ЦСПСБ сабраліся прадстаўнікі рабочай грамадзкасьці—брыгадзіры, якія выяжджалі ў раён для праверкі ходу загатовак мяса і рыбы, і кіраўнікі адпаведных раённых устаноў. Сабраліся, каб абмеркаваць становішча загатовак і адшукаць тыя тармазы, якія затрымліваюць нармальны ход кампаніі

З красавіка месяца крывая мясазагатовак пашла рэзка ўніз, месячныя пляны выконваліся ня больш чым на 50-60 проц., нарэшце, у верасьні, калі трэба было ліквідаваць прарыў ранейшых месяцаў і скончыць выкананьне гадавога пляну,—**загатоўлена ўсяго 40 проц. месячнага заданьня; прычым, па лініі Белкаапсаюзу плян выканан на 33 проц., а па лініі мапмясаюзу—на 47 проц.**

Яшчэ горш справа з кантрактацыяй —плян выкананы на 15 проц.

Слаба кратаецца наперад будаўніцтва халадзіль

„Пробкі“ на сплаве

Не дапусьціць, каб лёд зацёр лес

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Становішча са сплавам па р. Сож пагражаючае. Ёсьць небясьпека, што значная частка лесу будзе зацёрта ільдом. Мясцовыя арганізацыі не мабілізаваліся, каб па-бальшавіцку перамагчы труднасьці, мясцовыя арганізацыі ідуць на лініі найменшага супраціўленьня, засыпаючы цэнтр тэлеграмамі аб немагчымасьці выкаткі сплаву, аб недахваце рабочых рук, аб розных «аб'ектыўных» прычынах, якія зрываюць выкананьне заданьня.

І сапраўды па беразе Сожы стварылася пробка, ня выгружана 1.200 грабёнак лесу. На лесазводзе «Калектыўная Праца» трэба было паводле плану выцягнуць 40 тыс. куб. мэтраў драўніны, выцягнута толькі 20.000.

Ня лепш становішча на транзытным складзе пры лесазводзе. Кожны дзень прыбываюць грабёнкі з лесаматар'ялам, патрэбнымі Данбасу, але тэмпы работы такія павольныя, што выбіраецца з вады ня больш 30 проц. патрэбнай колькасьці.

Ці можна гаварыць аб тым, што няма рабочай сілы? Аб гэтым гаварыць ня прыходзіцца. На гомельскую культбазу штодзённа прыходзіць пленіт 50 кваліфікаваных плытагонаў, але работнікі Лесбелу іх не скарыстоўваюць. 5-га кастрычніка, напрыклад, прыбыла група плытагонаў у 25 чал. і прапанавала свае паслугі да канца восені. Яны ня былі скарыстаны і пайшлі назад, бо прадстаўнікі Лесбелу адмовіліся ім выдаць боты. Ёсьць выпадкі, калі навербаваныя рабочыя сядзелі па 5 дзён на культбазе і ня ведалі, што рабіць.

Сельсаветы не змаглі прыцягнуць рабочай сілы на сплаў. Яны вельмі дрэнна праводзяць прац. і гужавінасьць і ня прымаюць нізкіх мер да дэзэртыраў, якія ўхіляюцца ад яўкі. Напрыклад, в. Бабовічы абавязаліся даць 20 коняй і ня прыслала ніводнага.

Забесьпячэньне плытагонаў вельмі дрэннае. Сельскае спажывецкае таварыства працуе агідна, часта не хапае прадуктаў і прамтавараў.

Трэба, пакуль ня позна, мабілізаваць грамадзкасьць вакол сплаву. Усе прафарганізацыі, органы працы павінны зьвярнуць максымум увагі на выгрузку лесаматар'ялу.

З.

Хто вінаваты ў зрыве?

БЯГОМЛЬ. (Наш кар.). Чаму заданьне па сплаве па Бягомльскім вучастку ня выканана? Вялікая доля віны тут падае на прарабаў — работнікаў Лесбелу — **Плаўніка і Боднічa.** Увесь летні час яны амаль нічога не рабілі, не вербавалі рабочых, ня цікавіліся сплавам і толькі зараз, калі ўрад даў жорсткія дырэктывы, яны схамянуліся і пасьпешылі навярстаць упушчанае.

Гэтыя прарабы ўлетку адмаўлялі сялянам, якія прасілі паслаць іх на сплаў, а зараз яны з агнём шукаюць рабочых, якія згадзіліся прапаваць плытагонамі.

Улетку прарабы пабудавалі плыты, якія зусім ня былі прыстасаваны для пуску па каналу. Калі ім заўважалі, што гэтыя плыты ня пойдуць, бо вады мала, яны зрабілі пасвойму.

Мы не гаворым ужо тут аб самазабесьпячэньні за кошт плытагонаў, аб прысваеньні прадуктаў і прамтавараў, вызначаных на сплаў.

Гэтым работнікам ня месца ў апараце лясной прамысловасьці, а на лаўцы падсудных.

МЕНСК

Уноў пабудаванае гукавае кіно «Чырвоная Зорка»

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня 13-й гадавіны Кастрычніцкай Рэвалюцыі

Для падрыхтоўкі і правядзеньня сьвяткаваньня ў БССР 13-й гадавіны Кастрычніцкай Рэвалюцыі прэзыдыум ЦВК стварыў камісію пад старшынством тав. Хацкевіча, у складзе т. т. Платуна, Плешакова, Чарнушэвіча, Крузмата, Будзінскага, Палякова, Цімашэнка, Буравай, Пятушкова і Шпектарава.

Чырвоны сьцяг і трактар камуне „Праца“

Прэзыдыум ЦВК згадзіўся з пастановай конкурснага бюро пры рэдакцыі газ. «Савецкая Беларусь» аб прэміраваньні лепшай на конкурсе камуны «Праца», Каралінскага раёну, чырвоным сьцягам і трактарам.

Зямляўпарадкаваньне працоўных яўрэеў

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў арганізаваць пры ўсіх райвыканкомах БССР камісіі па зямляўпарадкаваньні працоўных яўрэеў.

Прыезд пралетарскіх пісьменьнікаў

Заўтра ў Менск прыяжджаюць старшыня міжнароднага бюро рэвалюцыйнай літаратуры, вэнгерскі пісьменьнік **Белла Іпеш** і адказны сакратар усесаюзнага аб'яднаньня асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў, **тав. Селіваноўскі.**

У Менску тав. Селіваноўскі зробіць некалькі дакладаў аб задачах пралетарскай літаратуры і творчай дыскусіі **адбудзецца таксама выступленьне Беллы Іпеша.**

СПОРТ

— Гэтымі днямі на пляпоўках саду «Прафінтэрн» адбудзецца **тэнісны матч** паміж камандай Ленінграду і Менску.

У ленінградзкай камандзе бяруць удзел лепшыя тэністы СССР, Мульціно і Шпігель.

***

— У лістападзе ў Маскве склікаецца **ўсесаюзная канфэрэнцыя фізкультурнікаў.** Ад БССР на канфэрэнцыю будзе накіравана 11 дэлегатаў, якія абраны на міжсаюзнай усебеларускай канфэрэнцыі фізкультурнікаў.

Першая гадавіна Менскага трамваю

Сёньня спаўняецца першая гадавіна работы Менскага трамваю. Роўна год назад, 13-га кастрычніка 1929 г., на вакзальнай плошчы адбыўся ўрачысты пленум Менскага гарсавету, прысьвечаны адкрыцьцю трамваю. Пасьля пленуму першы вагон трамваю рушыўся на горадзе.

Мы ўсе памятаем тыя спрэчкі, сумненьні, пэсымістычныя прароцтвы, адносна пабудовы трамваю. Нават адказныя работнікі гаварылі, што нельга правесьці трамвай па вузкіх вуліцах Менску, што гэта дарэмная трата сродкаў, што па вуглу Ленінскай і Савецкай, дзе лінія трамваю блізка падыходзіць да тратуару, нямінуча будуць кожны дзень чалавечыя ахвяры.

Клясава-варожы элемэнт шаптаў за вуглам, што з трамваю нічога ня выйдзе, што толькі дарэмна каналі вуліцы, што першы-ж рэйс трамваю скончыцца няўдачай, што бальшавікі, наогул, могуць толькі ламаць, а не будаваць.

Жыцьцё разьбіла ўсе гэтыя прароцтвы.

Значнае зьніжэньне кошту праезду—10 кап. замест 20 на аўтабусе, хуткія зносіны паміж адрэнамі гораду, добра наладжаны рух зрабілі Менскі трамвай для працоўных самым патрэбным, танным і папулярным сродкам транспарту. Некалькі лічбаў лепш за ўсякія словы гавораць аб гэтым.

Лік вагонаў з 8 у першым квартале павялічыўся да 16 у чацьвертым. Лік перавезеных пасажыраў з 1.502.000 у першым квартале павялічыўся да 4.315.000 у чацьвертым. Усяго за год перавезена 10.707.000 пасажыраў.

Трамвай даў за год 620.000 руб. чыстага прыбытку.

Гарадзкі савет выдаткаваў на пабудову трамвая першай чаргі 1.800.000 руб. **Затрачаная сума будзе акуплена на працягу 3-х год.**

Дзякуючы трамваю, удалося, параўнальна, бяз усякіх перашкод абслугоўваць экскурсантаў усебеларускай выстаўкі.

Зараз паўстае пытаньне аб пабудове другой чаргі трамваю па новых маршрутах: Кальварыя—Сэрабранка і Ляхаўка—Пляц Волі.

Інж. МАКСІМЕНКА.

Калектывізацыя ў раёнах нацсаветаў БССР

На пасяджэньні прэзыдыуму ЦВК старшыня Белкалгасцэнтру, тав. **Міцькоў** зрабіў даклад аб калектывізацыі ў раёнах нацсаветаў.

На тэрыторыі былых округ: Гомельскай, Вабруйскай, Мазырскай, Аршанскай і Віцебскай лік калектывізаваных гаспадарак працоўных яўрэеў за апошні год павялічыўся з 1.305 да 2.796. Колькасьць яўрэйскіх калгасаў, у зьвязку з іх узбуйненьнем і аб'яднаньнем, зьменшылася са 153 да 61. На тэрыторыі БССР ёсьць 86 польскіх нацыянальных калгасаў, якія аб'ядноўваюць 1194 гаспадаркі, ці 6116 едакоў. Значная частка прапоўных палякаў аб'яднана ў іншых калгасах БССР.

Процант калектывізацыі **сялян-латышоў** дасягае 28,2. Гэты процант значна вышэй сярэдняга процанту калектывізаваных сялянскіх гаспадарак на Беларусі. Усяго налічваецца 14 латыскіх калгасаў.

Слаба настаўлена культурна-бытавое абслугоўваньне нацыянальных калгасаў, а таксама работа з беднатой.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б 15 кастрычніка, а 6-й гадз. увечары (заля пасяджэньняў) склікае **ПЛЕНУМ РК КП(б)Б** з абвесткай дня:

1. Папярэднія вынікі рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б).
2. Становішча работы сярод жанчын у раёне.

На пленум абавязаны зьявіцца ўсе члены і кандыдаты райкому, сакратары парт'ячэек, кіраўнікі прадпрыемстваў, старшыні фабзаўмясцкомаў—партыйцы.

Запрашаюцца члены рэвізійнай камісіі і РККІ.

Яўка абавязкова.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б сумесна ЦСПСБ 18-га кастрычніка г.г. у Доме Камасьветы (клюб імя Карла Маркса) 6-й гадз. увечары склікае **РАЁННУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ ЎДАРНІКАЎ** з абвесткай дня:

1. Вынікі 2-га году пяцігодкі, задачы рабочых раёну ў выкананьні прамфінпляну ўдарнага кварталу і падрыхтоўка прамфінпляну 3-га году пяцігодкі.
2. Судаклады аб барацьбе прамфінпляну і ліквідацыі прарываў на прадпрыемствах: «Камунар», «Кастрычнік», завод «Д. А.», друкарня БДВ.
3. Прэміраваньне асобных прадпрыемстваў раёну.

ФРК КП(б)Б і ЦСПСБ.

ЦП саюзу саўгандальслужачых паведамляе, што 14 кастрычніка, а 7 г. увеч., у памяшк. клюбу СГС склікаецца **Менская гарадзкая канфэрэнцыя крэдытна-фінансавых работнікаў.**

У парадку дня: 1) Даклад НКФ аб фінансавым становішчы і чарговых задачах на поўным выкананьні плянавых заданьняў і ліквідацыі маючыхся прарываў, 2) Рапарты МК Дзяржбанку, Калгасбанку, Ашчадкасы і НКФ аб канкрэтна праробленай рабоце па выкананьні адозвы ЦК УсеКП(б) па ліквідацыі прарываў.

Яўка на канфэрэнцыю дэлегатаў, старшынь МК і прафактыву крэд.-фін. установаў абавязкова без спазьненьня.

Запрашаюцца рабочыя заводаў «Энэргія» і «Бальшавік», а таксама працаўнікі рах. фін. бухгальтарскіх груп, адм., сав. і гандл. каап. установаў.

16-га кастрычніка г.г. склікаецца **агульна гарадзкі актыў камсамолу.**

Парадак дня: Даклад аб выніках кастрычн. пленуму ЦК ЛКСМБ.

Актыў адбудзецца ў памяшканьні Дому Камасьветы а 7-й гадзіне ўвечары.

14 кастрычніка, а 11 гадз. ран., у памяшк. бібліятэкі імя Пушкіна (Кастрычніцкая вул., д. № 5) адбудзецца **АГУЛЬНЫ СХОД БІБЛІЯТЭЧНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ** усіх бібліятэк палітасьветы, прыгарадных хат-чыталеньн. бібліятэк школ сацвыху і бібліятэкі Дому Працасьветы па пытаньні аб удзеле бібліятэк у вытворчых мацоўрах.

Яўка ўсіх прапаўнікоў памянёных бібліятэк абавязкова і без спазьненьня.

Цэнтральнае праўленьне прафсаюзу гарбароў Беларусі

склікае ў памешканьні ЦП саюзу (Дом Працы, 3-ці паверх, пакой 17) на 13 кастрычніка, а 6 гадз. увеч.

ЗЬЛЁТ ВЫЛУЧЭНЦАЎ ЧЛЕНАЎ САЮЗУ ГАРБАРОЎ,

што працуюць за Ўстановах і прадпрыемствах г. Менску, сумесна з кіраўнікамі ўстаноў

па пытаньні аб умовах працы вылучэнцаў і ўзмацненьні сувязі іх з саюзам.

ЦП саюзу гарбароў.

Сёньня, 13 кастрычніка, а 8 г. увеч., у малой залі ЦП саюзу адбудзецца

АГУЛЬНЫ СХОД членаў усіх марксыцкіх таварыстваў

З ПАРАДКАМ ДНЯ:

«Задачы таварыстваў марксыстых на даным этапе сац. будаўніцтва».

Пасьля агульнага сходу—устаноўчыя сходы для арганізацыі марксыцкіх таварыстваў: аграрнікаў, дзяржаўнікаў, педалёга-педагогаў і марксыстых літаратуразнаўцаў.

На сход запрашаюцца ўсе камуністыя—выкладчыкі вузаў і камуністыя—асьпіранты.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— **Кастрычніцкі РК КП(б)Б** паведамляе, што прыём і пачатак заняткаў у ВСШП—13 кастрычніка. Ячэйкі заводаў «Бальшавік» і «Энэргія» партыкалектываў чыгункі, абутковай ф-кі і МПРК—камплектуць набор у ВСШП па сваіх прадпрыемствах, пад кіраўніцтвам і адказнасьцю кіраўнікоў партгрупоўбы і сакратароў парткалектываў. Усе іншыя ячэйкі раёнаў — пад асабістую адказнасьць кожнага сакратара, павінны пазнаёміцца з запісанымі ў ВСШП 13 кастрычніка роўна а 7 гадз. увеч. у памяшк. 7-годкі на Інтэрнацыянальнай вуліцы № 25, школа № 1. Незьявіўшыяся на іспыты ня будуць прыняты.

— **Кастрычніцкі РК КП(б)Б** прапануе зьявіцца 13 кастрычніка, а 7 гадз. увеч., у памяшк. РК наступныя т.т.: Кудлач, Ліманоўскі, Самойлаў, Швэдко, Юргенсон, Ярыгін (МРВ), Бурцэвіч, Гнецька, Іваўчанка, Капура, Мецік, Рагачэўскі (дэпо), Аверын, Гайдукевіч (шлях), Гершман, Коваль, Палякоўскі, Асаенак, Русіновіч (абутк. ф-ка), Цапушкін, Пракофьева, Карэлаў, Бірыла (Хэмфармзавод), Масеніч («Чырв. Зорка»), Фенгіна, Кубліна, Гелер, Айн, Янушкевіч, Эйдзінаў, Бандарчык, Румянаў (скуразав.), Карпілаў (абутк. майст.), Чэмко (УМТ), Яфімаў, Шпітко, Крэсік, Рабіновіч, Галаскоп, Варашылаў, Шэндаровіч, Нікольскі, Станкевіч, Сідаровіч, Філатаў, Даўгулевіч, Ластоўскі (банк. уст.), Бурачэўскі, Ландаў, Гінзбург, Еленевіч, Каган, Аляксеў, Хэўлін (БКС), Боброк, Жук, Зубаў, Налівайка, Фандарэнка, Якабсон (РСІ), Дамброўскі (ЦП мэталіст.), Кунік (муз. рэв.), Рубін (Чырв. Кр.), Кардашэнка, Іваўчанка, Залескі (НКФ), Юдэльзон (пракуратура), Бабінскі («Адрадж.»), Крэнь, Кавалеўскі, Шышко (ЦП хэм.), Харэнка (скурсынд.), Вальфоўскі, Бацьвінік, Гурэвіч, Пэральман, Кушнароў, Гантман, Блюмкін (БСПС), Ліхадзіеўскі, Мазо, Рахкін, Мацкін, Рубенчык, Шойгаўз, Камінская (шчап. ф.), Камэнштэйн (ЦСПСБ), Лацис, Нядбальскі (Белмаляводсаюз), Пыжыкаў, Вішнеўскі, Камунараў, Рутковскі, Таланіла (Белсадсаюз), Гайдук (БСПКА), Смарыгін, Касавер (мер і вап), Вількот, Бачытча, Ліўшыц (БМЖС), Матусевіч (ваг. майст.), Манусевіч (штот. фаб.), Біге.

СЁНЬНЯ:

— **Фрунзаўскі РК КП(б)Б** паведамляе ўсіх слухачоў першапачатковай партыйнай школы, што заняткі адбудуцца 13 кастрычніка, а 7 гадз. увеч., у памяшк. 4-й 7-годкі (Савецкая, 95, супроць сквэра). Аб дні заняткаў у рыніных групах будзе паведамлена асобна.

— **Фрунз. РК МОПР'у.** А 7 гадз. увеч., у памяшк. ЦК МОПР'у адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму Фрунзаўск. РК МОПР'у.

— **Пэдгабінэт.** У 19 гадз. — сход пастаўн. 1-х груп.

№ А 6 гадз. увеч., у памяшк. ЦП саюзу працасьветы (Дом Працы, 3-ці паверх, пак. № 13) адбудзецца сход беспрацоўных пэдагогаў — членаў саюзу працасьветы. Яўка ўсіх абавязкова.

№ А 6 гадз. увеч., у памяшк. рэдакцыі «Акцябр» (Рэвалюцыйная, 2, 4-ты паверх) адбудзецца нарада аб выдавецкім пляне мастацкай літаратуры на яўр. мове на 1931 год. Запрашаюцца ўсе яўрэйскія пісьменьнікі, бібліятэкары клюбных бібліятэк, выкладчыкі літаратуры, прадстаўнікі культсэктараў: шчэйнай ф-кі «Акцябр», скарняжнай, шчотачнай, шчаціннай, абутковай; заводаў: «Энэргія», «Камунар», будаўнікі, культсэктары ЦСПСБ і ЦП прафсаюзаў, яўр. сэктар БАН і кніжны калектар ЦСПСБ. Просьба не спазьняцца.

— **БДУ.** Перавыбарчы сход ячэйкі ЛКСМБ ф-ту саўбуду і права БДУ адбудзецца а 7 гадз. увеч., у гал. корпусе, 3-ці паверх. Яўка камсамольцаў абавязкова. Запраш. члены партыі і беспартыйн. студэнцтва.

ЗАЎТРА:

— **Дом Камасьветы.** А 6 гадз. адбудзецца вечар партактыву. Даклад тав. Сяньксеіна: «Контр-рэвалюцыйная сутнасьць нацыянал-дэмакратаў». Білеты па РК 1 ў чытальні Дому.

— **Пэдгабінэт.** А 7 гадз. увеч. — сход пост. «о» груп.

— **ЦБ СНП.** А 7 гадз. увеч., у залі дому Асьветы, склікаецца агульны сход навук. працаўнікоў разам з асьветнікамі г. Менску. У парадку дня: даклад т. Будзінскага аб падзеях у Заходняй Украіне.

— У клюбе навук. працаўнікоў а 6 гадз. увеч. адбудзецца нарада антырэлігійнага аддзелу культмасавага сэктару СНП. На нараду запрашаюцца у абавязковым парадку т.т. Крывіцкі, Вальфсон, Валабрынскі, Шапавалаў, Стальны, Ноткін, Югаў, Буткевіч, Панкевіч, Нікольскі, Ігнатоўскі, Усьпенскі, Гесін, Кернажыцкі, Віткоўскі, Сосіс, Піотуховіч, Чарвакоў, Мацулайціс, Каган, Маўрыдзіадзі, Акімава, Гусева, Гелер, Герке, Змачынскі, Цір, Гімельфарб, Вяршук, Разанаў, Татаренчык, Яхімовіч, Глот-Вяршук, Зубковіч, Сяўскі, Ярмаленка, Колпікаў, Цітоў, Мядзёлкін, Ленц, Туркевіч, Кроль, Сандамірскі, Сьмірноў, Эльбэрт, Суцін, Багдановіч, Голуб, Перебіла, Чарнушэвіч, Фенчанка, Лявонаў і Камінская-Паўлова, а таксама ўсе жадаючыя навуковыя працаўнікі.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

— **Фрунзаўскі РК КП(б)Б** паведамляе, што заняткі ў ВСШП пачнуцца 15 кастрычніка а 7 гадз. увеч., у памяшк. 2-й сямігодкі (Ленінская, супроць пошты). Усе т.т., якія прайшлі прыёмныя іспыты, павінны зьявіцца ў абавязковым парадку. Адначасова паведамляецца, што прыёмныя іспыты працягнуцца да 20 кастрычніка.

— **Клюб навук. працаўнікоў.** А 7 з пал. г. увеч. адбудзецца пасядж. праўленьня клюбу навук. працаўнікоў, на якое запрашаюцца т.т. Ленц, Эльбэрт, Пятроў, Розэнфер, Вальфсон, Сосіс, Чарвакоў, Атеяў (НДІ), Веленкін, Даніэльчык, Ноткін, Ваўчонак, Камінская-Паўлова, Шэмяэль-Гелер.

— Асьпіранты БДУ, БАН і Камвуз, якія яшчэ не зарэгістраваліся ў групе моваў і сэмінары, павінны зарэгістравацца ў 2-хдзённы тэрмін, у працяўным выпадку будуць лічыцца мэханічна выбыўшымі.

— Даводзіцца да ведама хатніх работнік мясцкому № 3, што з 11 кастрычніка пачаліся заняткі ліквбезу, у памяшк. школы № 44 (Савецкая вул., супроць МК № 3). Няпісьменныя і малапісьменныя павінны ў абавязковым парадку зьявіцца не пазьней 15 кастрычніка.

— **Камвуз Беларусі імя У. І. Леніна** паведамляе, што заняткі на савецкім і прапагандысцкім адд. 1-га курсу Камвузу, аддзяленьні нацмен, курсах газэтных работнікаў, пачнуцца 9 лістапада. Усе т.т., залічаныя на памянёныя аддзяленьні павінны да гэтага тэрміну зьявіцца ў Камвуз. Кватэра прыскаўшым прадастаўлена ня будзе. У гэты-ж тэрмін павінны зьявіцца ўсе т.т., якія дапушчаны да іспытаў на аддзяленьні нацмен і газэтнае.

— 14 кастрычніка 30 г., у ВАН, у пак. № 15 адбудуцца першыя заняткі сэмінара па дыялекмату пад кіраўніцтвам т. Арацюняцава для асьпірантаў гісторыкаў а 10 гадз. ран., для асьпірантаў эканамістых — а 12 г. дня.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

ФРУНЗАЎСКІ РК КП(б)Б

паведамляе, што сёньня, 13 кастрычніка, а 6 гадз. увеч., у памяшк. клюбу працасьветы (Камуністычная вул.) склікаецца

ШЫРОКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ЖОНАК РАБОЧЫХ

ПА ПЫТАНЬНЯХ: 1) Аб удзеле жонак рабочых у выкананьні прамфінпляну 3-га году пяцігодкі. 2) Аб рабоце забесьпячэньня і грамадзкім кантролі па кашэраньні. 3) Ліквідацыя няпісьменнасьці.

Модуе выбараў: ад 5 жонак—1 дэлегат.

РК прапануе ўсім вытворчым ячэйкам і фракцыям жактаў забясьпечыць поўную яўку на канфэрэнцыю.

ЦП САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ

паведамляе, што сёньня, 13 кастрычніка, а 7 гадз. увеч., у памяшк. клюбу СГС адбудзецца

ПАКАЗАЛЬНЫ СУД

над злачынцамі-работнікамі МЦРК крамы № 142—Школьнікавым, Зарэцар і Кастаравым.

ЦП саюзу запрашае ўсіх прапаўнікоў МЦРК зьявіцца ў памяшканьне клюбу саюзу СГС у вызначаны час.

Кіно „Юны піянэр“

З панядзелка, 13 кастрычніка

Трэка-прыгодніцкі фільм у 4-х сэрыях і 34 частках

СТЭНЛЕЙ у НЕТРАХ АФРЫКІ

1-я сэрыя „Адзін супроць многіх“

у 8 частках

У гал. рол. Чарльз МАСОН і Луіза ДОРЭЙН.

Штодзённа 2 сэансы. Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.

КАСА АДКРЫТА З 12 Г. ДНЯ.

КІНО **„СПАРТАК“**

З панядзелка, 13 кастрычніка

З ПРЫЧЫНЫ ПОСЬПЕХУ

2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі

„БЭЛА“

ДРАМА Ў 8 ЧАСТ.

паводле раману Лермантава.

Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г. і 10 г. 45 м.

КАСА—АД 6 ГАДЗ. УВЕЧ.

Из падстаў пастановы Прэзыдыуму Гарсавету ад 10-га кастрычніка г.-г. за № 61,

У СУВЯЗІ З ПЕРАГРУЗКАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

ЭЛЬВОД зараз будзе праводзіць **абмежаваньне карыстаньня электра-энэргіяй**

ва ўсіх установах і прыватных спажыўцоў, шляхам плёмбаваньня патронаў на час да пуску новага турбагенэратора, які будзе пушчаны ў лістападзе г. г.,

прычым у прыватных спажыўцоў будзе пакінута ня больш 2-х лямпачак.

Адначасова Эльвод заклікае абавятаў да эканомнага карыстаньня электраэнэргіяй а с а б л і в а, з 19-ай да 23-й гадзіны

ЭЛЬВОД.

ЦП саюзу саўгандальслужачых паведамляе, што згодна пастановы Прэзыдыуму ЦП, з 14-га па 20-е кастрычніка г. г. уключна праводзіцца

ПЕРАПІС УСІХ БЕСПРАЦОЎНЫХ

членаў саюзу саўгандальслужачых

НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ:

4-Х—прозьвішчы якіх пачынаюцца літарай А, Б, В, Г, Д, Е, Ж.
5-Х— » » » » З, І, К, Л, М.
6-Х— » » » » Н, О, П, Р, С.
7-Х— » » » » Т, У, Ф, Х, Ц.
8-Х— » » » » Ч, Ш, Щ, Э, Ю, Я.

19 і 20-Х—зьяўляюцца на перапіс усе спазьніўшыяся.

Лучы на перапіс падлягаюць у абавязковым парадку таксама і беспрацоўныя члены саюзу СГС, якія знаходзяцца на курсах па перакваліфікацыі, як у: Цэнтральным Інстытуце Працы, заводах і фабрыках «Энэргія», «Бальшавік», «Камунар» і г. д. Таксама і іншых курсах.

Беспрацоўныя члены саюзу СГС, якія не зьявяцца ў вызначаныя даты, будуць зьняты з вучоты і выключаны з членаў саюзу, а тыя, што знаходзяцца на курсах па перакваліфікацыі, будуць пазбаўлены выдачы дапамогі па беспрацоўі.

Перапіс будзе праводзіцца ў памяшк. ЦП саюзу СГС з 10 да 3 г. дня і з 6 да 8 г. увеч.

Старшыня ЦП саюзу СГС ПЛЯТНЕЎ.

КІНО-ТЭАТР **„КУЛЬТУРА“** Ад панядзелка, 13 кастрычніка

Лепшая камэдыя сэзону па злобу дня

ТРУП ДЭ-ЮРЭ

СЁНЬНЯ ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ

ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ Пачатак а 1 г. і 2 г. 30 м. ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ Пачатак а 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 30 м.

Галоўн. ролю «Труп дэ-юрэ» выконвае арт. П. ЗІНОЎЕЎ.

ПРА ДВА ЗАВОДЫ

Фільм у 1 частцы, вытворчы Белдзяржкіно.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ

удзень і ўвечары гастролі

лепшага ілюзяніста-трансфармэтара **Н. СІМЭНС**

УВАГА! З сёньнешняга дня

ў кіно „КУЛЬТУРА“ ўводзяцца ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ.

КАСА ДЛЯ ДЗЕН. СЭАНСАЎ АДЧЫНЕНА ад 12 гадз.

—) Пры калект. наведваньні—СКІДКА. (—

КАСА ДЛЯ ВЯЧЭРНІХ СЭАНСАЎ АДЧЫНЕНА ад 5 гадз.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“

Сёньня, 13 кастрычніка і штодзенна

2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі

АМЭРЫКАНСКІ ФІЛЬМ

Сцэнары Эліот КЛАЎСОН паводле навэлі Дэль КОЛІНСА „САНТЫМЭНТАЛЬНЫ“

КАПІТАН ЛЯТАЮЧАЙ ЧАРАПАХІ

(БЭЛЬ з СІНГАПУРА).

Драма ў 8 частках.

У гал. рол. Алан ХЭЛЬ і Філіс ХЭВЕР.

ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ. Пачатак 1-га сэансу а 6 г., 2-га—7 г. 30 м. 3-га—9 г., 4-га—10 гадз. 30 м.

КАСА АДКРЫТА з 5 гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“

Ад панядзелка, 13 кастрычніка

ГЭРАІЧНАЯ АПОВЕСЬЦЬ З ГІСТОРЫІ ЧЭЧНІ

ЗЭЛІМ ХАН

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: ВЯДОМЫЯ КАЎКАЗКІЯ АРТЫСТЫЯ:

Ладо БАСТАЕЎ, Т. МАНЧАВАРЫ, ЯНІ і інш.

ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ.

Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. увечары. КАСА адчынена ад 5 гадз.

НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

пры ВСНГ БССР

абвяшчае набор асьпірантаў

ПА НАСТУПНЫХ СПЭЦЫЯЛЬНАСЬЦЯХ:

Інж.-керам. па грубой кераміцы 2
Тэхнік па тонкай кераміцы 1
Інж.-спэц. па новых будаўн. матар'ялах . . . 1
Спэцыяліст па шкле . . 1
Інж.-спэц. па тэхналёгіі мінэр. угнаеньняў . . 1
Хэмік-аналітык (мінэралёг) выш. адукац., спэц. . 1
Інж.-цёплатэхнік . . . 1
Таксама з цёплафікац. ухілам 1
Інж.-электратэхнікаў . . 2
Інж.-гідратэхнік 1
Хэмік-арганік 2
Інж.-тэхн. скуран. . . 1
Інж.-хэмік арган. . . . 1
Інж.-тэх. спэц. тэкст. . . 2
Фінансісты 1
Плянавік 1
Спэц. па хэміі торфу . 2
Інж.-тэхн. спэц. па каксав. і газафік. торфу . 1
Інж.-торфмэйстар (спэцыялісты па здабычы торфу) 1
Геабатанік (спэц. па балотн. флёры) 1

Прыём заяў вытвараецца штодзённа з 9 да 16 гадзін да 20-га кастрычніка 1930 г. у канцылярыі Інстытуту Прамысловасьці (Менск, Рэвалюцыйная № 1). Для залічэньня ў асьпіранты неабходна прадставіць:

1. Дакумант аб адукацыі.
   УВАГА: Адукацыя патрабуецца вышэйшая, па лініі ВТУЗ'аў, Інжынэрна-мэліяратыўных факультэтаў прамысловых аддзяленьняў эканамічных ВУЗ'аў і прыродазнаўчых аддзяленьняў пэдфакаў.
2. Дакумант аб сацыяльным становішчы і паходжаньні.
3. Кароткая біяграфія.
4. Водзыў акадэмічных і грамадзка-студэнцкіх арганізацый.

Дырэкцыя НДІ Прамысловасьці.

РАХУНКОВА-БУХГАЛЬТАРСКІЯ КУРСЫ

пры біржы працы.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ЗАЯЎ НА ЦЫКЛЫ:

саўгасны, каапэрацыйны, крэдытны і прамысловы.

Прымаюцца скончыўшыя ня ніжэй 7-годкі, якія задавальняюць патрабаваньням рэгістраціі іх на біржы працы і маюць ня менш 17 год.

Слухачы, якія далі падпіску аб рабоце на пэрыферыі, будуць забясьпечаны стыпэндыямі.

Запісь і даведкі выдаюцца штодзённа ад 7-9 г. увеч. у канц. курсаў—Міхайлаўская вул. на пл. Віленскага рынку, 3-я школа, 2-гі паверх.

Для здачы **АБВЕСТКІ** у газэту **„ЗЬВЯЗДА“** званоце па тэл. **7-81**

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты **„ЗЬВЯЗДА“** званоце па тэл. **2-49**

ЗАВОЧНЫЯ БУХГАЛЬТАРСКІЯ КУРСЫ

Прыём слухачоў праводзіцца круглы год.

Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьветай ня ніжэй 5 гр. 7-годкі.

ПЛАТА ЗА КУРС 33 руб.

праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц і па 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца

Заявы, запытаньні і грошы накіроўваць па адрасе: Менск, пошта, скрынка 44, Завочным курсам.

На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

Кошт публікацыі 50 к. аб згубе 1 дакумэнту

Паведамленьні ў чарговы нумар **„ЗЬВЯЗДЫ“** прымаюцца да 2 гадз. дня.

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск. Менск. Галоўлітбел